ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдання—XV
№ 11 (4263)
Чацьвер, 14 студзеня 1932 г.
МЕНСК, Свярдлова 31

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: Перадавая—Забясьпечыць баявую сустрэчу 3-й бальшавіцкай вясны (1-я стар.). А. ПЛАТУН—Некаторыя пытаньні культурнай рэвалюцыі (2 стар.). В. САМАХВАЛАЎ—На грані другой пяцігодкі (3 стар.).

Лепшым завяршэньнем збожжазагатовак да XIV зьезду КП(б)Б заваяваць пяршынства (1 стар.).

Прыйсьці да парт'зьезду з рашаючай перамогай на фронце ільназагатовак справа гонару кожнага раёну, сельсавету, калгасу (1 стар.).

Пад сьцягам бальшавіцкай непрымірымасьці да ўсялякіх спроб рэвізіі агульнай лініі партыі праходзяць райпартканфэрэнцыі (2 стар.).

Пачаўся ўсебеларускі фінансавы паход (3 стар.).

Справа гонару друку—агляд друку (3 стар.).

Перадавыя прадпрыемствы БССР рыхтуюць да зьезду рапарты аб перавыкананьні перамог (3 старонка).

Рэзалюцыя ЦК КПП (4 стар.).

Румынія гатова да інтэрвэнцыі (4 стар.).

„Ні аднаго цэнтнера збожжа прыватніку" (ЦК УсеКП(б.

УСІМ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯМ

XIV зьезд КП(б)Б пераносіцца на 23 студзеня 1932 г.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ.

Забясьпечыць баявую сустрэчу трэцяй бальшавіцкай вясны

На аснове індустрыялізацыі ўсяго Савецкага Саюзу і БССР мы скончылі трэці год пяцігодкі і дабіліся значных перамог у справе рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Ужо ў гэтым годзе больш паловы ўсіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак аб'яднаны ў калгасы. Пасеўная плошча сацыялістычнага сэктару параўнальна з 1930 годам патроілася. Плошча пад тэхкультурамі павялічылася з 153.000 да 270.000 га. Шляхам разгортваньня будаўніцтва МТС—гэтых апорных пунктаў сацыялістычнай калектывізацыі—мы падводзім пад сельскую гаспадарку магутную перадавую жалезную базу. 27 МТС з 1911 трактарамі ў мінулым годзе працавалі на калгасных палёх. Ня меншых посьпехаў мы дабіліся і ў галіне разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Апублікаваная гэтымі днямі пастанова ЦК КП(б)Б і СНК аб веснавой пасеўнай кампаніі 1932 году мае выключна важнае палітычна-гаспадарчае значэньне. Гэта пастанова зьяўляецца баявой праграмай работы ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый для пасьпяховага выкананьня плянаў чацьвертага рашаючага году пяцігодкі.

Перад намі з усёй вострасьцю стаіць задача замацаваць дасягнутыя посьпехі і стварыць усе ўмовы для далейшага наступленьня на ўсім фронце.

Умовай далейшых посьпехаў зьяўляецца рэалізацыя пастаўленай партыяй праблемы—арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і барацьба за якасьць сацыялістычнай вытворчасьці. Укараненьне зьдзельшчыны ў калгасах, разьмеркаваньне даходаў па колькасьці і якасьці ўкладзенай працы ўжо далі свае вынікі, непасрэдна абліліся на прадукцыйнасьці працы і росьце калгаснай гаспадаркі. На гэтай аснове мы зможам дабіцца завяршэньня ў асноўным сацыяльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як класы ў 1932-33 годзе ў тэрміны, устаноўленыя ЦК УсеКП(б).

Трэцюю бальшавіцкую вясну частка калгасаў сустракае, маючы за плячыма да двох год практыкі барацьбы за сацыялістычную вытворчасьць. Але для значнай часткі гэта веснавая кампанія будзе першай. У галіне арганізацыі працы, укараненьня зьдзельшчыны, ліквідацыі абязьлічкі, пастаноўкі ўліку перадавых калгасаў пабыў багаты вопыт. Наш абавязак—гэты вопыт перадавых калгасаў перанесьці ва ўсе іншыя і асабліва ў поваарганізаваныя калгасы.

У часе як веснавой, так і ўборачнай кампаніі мы мелі рад істотных недахопаў. Адзін з асноўных прычын гэтых недахопаў была дрэнная арганізацыя працы. Аб гэтым дзяволі краснамоўна гаворяць наступныя даныя.

Ураджайнасьць у калгасах па збожжавых вышэйшая, чым у аднаасобнікаў, але яшчэ ўсяго толькі на 4.76 проц., а па яравых—па 4.61 проц. Ураджайнасьць у саўгасах вышэйшая, чым у калгасах па збожжавых на 18.18 проц., а па яравых—па 19.11 проц. У дрэннай арганізацыі працы спроба шукаць тлумачэньня і таго факту, што план зяблевай кампаніі выкананы усяго на 47,8 проц., а пасеў вазімых—па 93.6 проц.

Дрэнная арганізацыя працы і скажэньні, дапушчаныя пры разьмеркаваньні даходу, таксама зьявіліся ў пэўнай ступені тормазам выкананьня калгасамі сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай па загатоўках. Ураўніўка і меўшая месца тэндэнцыя ў радзе калгасаў аплачваць працу калгасьнікаў выключна натурай, няўменьне правільна спалучыць натуральную і грашовую выплату—спрыялі клясаваму ворагу разьвіваць спажывецка-рвацкія тэндэнцыі сярод адсталай часткі калгасьнікаў. Усё гэта прыводзіла да асяданьня значных таварных лішкаў у паасобных калгасьнікаў. Гэтыя скажэньні падрывалі працоўную дысцыпліну і тармазілі рост таварнасьці калгасаў.

Гэта абавязвае ўсе нізавыя і цэнтральныя арганізацыі неадкладна выправіць усе дапушчаныя скажэньні і промахі ў рабоце, каб у будучым іх не паўтарацьць. Недаўкладнае асеньніх кампаній па зяблеве і сяўбе азімых павінна быць перакрыта ўдарнай работай саўгасаў, калгасаў і аднаасобнікаў вясной. Неадкладна скончыць усе віды загатовак і ў першую чаргу збожжазагатоўкі. Уключыцца ў абвешчаную ЦКК-НК РСІ, рэдакцыямі газэт «Правда» і «Соцземледелие» ўсесаюзную праверку завяршэньня збожжазагатовак і падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай, сваячасова правесьці канчатковае разьмеркаваньне даходаў у калгасах і па-баявому пераключыцца на падрыхтоўку да сяўбы.

Пастановай ЦК і СНК БССР намечана пасеў яравых на плошчы ў 2.850.000 гэкт., з іх 700.000 гэкт. пад бульбай, 370.000 гэкт.—пад тэхкультурамі, 1.160.000—збожжавымі, 380.000—кармовымі травамі і 55.000 гэкт.—пад кораньплодамі. Параўнальна з мінулым годам пасеўная плошча павялічваецца на 23,5 проц. Павялічэньне ўраджайнасьці запраектавана па збожжавых на 12 проц., травах і тэхкультурах—на 15 проц., бульбе—20 проц. і рост прадукцыйнасьці жывёлагадоўлі—на 20 проц.

МТС, лік якіх павялічваецца ў гэтым годзе да 56, засеюць яравых у калгасным сэктары 30 проц. замест 27 проц. у мінулым годзе. Значнае павялічэньне ўдзельнай вагі сацыялістычнага сэктару ў параўнаньні з мінулай вясной, завоз с.-г. інвэнтару і машын на 10 млн. руб., завоз угнаньняў і г. д. ствараюць зусім спрыяючыя ўмовы для пасьпяховага правядзеньня сяўбы. Дадатковае будаўніцтва 47 ільназаводаў і чатырох пеньказаводаў зьяўляецца стымулам для яшчэ большага павялічэньня плошчы пад тэхкультурамі і далейшага папаўненьня спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі БССР.

Намечаны рост пасеўнай плошчы і ўраджайнасьці вымагае ад нас максымальнага напружаньня сіл і скарыстаньня ўсіх сродкаў. Правільная арганізацыя працы, поўнае правядзеньне ўсіх агратэхнічных мерапрыемстваў і ўдарная падрыхтоўка зьяўляюцца неабходнымі ўмовамі для выкананьня плянаў пасеўнай.

Поўная загрузка ўсяго конскага парку і правільнае спалучэньне яе з трактарнай цягавай сілай вырашаць посьпех веснавой сяўбы. Аднак, мы ўжо наглядаем тэндэнцыі ў сувязі з завозам трактараў і будаўніцтвам новых МТС здаць капа ў архіў. Гэта недаацэнка конкай цягавай сілы, якая мае месца ў радзе раёнаў, павінна атрымаць рашучы адпор. Ліквідацыя абязьлічкі, прымацаваньне коняй да калгасьнікаў і рашучая барацьба з незаконным забоем і злачыннымі адносінамі да коняй — такім шляхам павінна ісьці замацаваньне і падрыхтоўка конскага парку да палявых работ. Увесь конскі парк калгасаў і бядняцка-серадняцкага сэктару павінен быць у поўнай гатоўнасьці да сяўбы.

Пастановай ЦК і СНК тапы пэўныя тэрміны паконт стварэньня насенных страхавых і фуражных фондаў. Засыпка насенных фондаў — надзвычай адказная кампанія асабліва таму, што насевы ў калгасах павінны быць забясьпечаны цалкам уласным насеньнем. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута па стварэньне і аграмаджаньню насенных фондаў у нова-арганізаваных калгасах і нова ўступіўшых калгасьнікаў. Наогул, аграмаджаньне асноўных сродкаў павінна разглядацца з пункту гледжаньня адносін нова-ўступіўшых калгасьнікаў да калгасу.

Таксама даны пэўныя тэрміны па правядзеньні ачысткі насеньня, рамонту с.-г. машын, збруі і г. д. Усе гэтыя пытаньні павінны заняць належнае месца ва ўсёй падрыхтоўчай рабоце. Ня менш важнае значэньне набывае справа забясьпячэньня пасеваў насеньнем кармовых траў. Ня гледзячы на тое, што тэрмін загатовак прайшоў, намечаныя плошчы пасеваў не забясьпечаны яшчэ насеньнем.

Раённыя арганізацыі павінны памятаць, што сваячасова і ў мінімальна кароткі тэрмін правесьці сяўбу можна толькі пры тэй умове, калі на пытаньні падрыхтоўчай работы будзе зьвернута ўвага ўсёй партыйна-савецкай грамадзкасьці, усёй калгаснай масы. Посьпех пасеўнай кампаніі будзе залежаць ад таго, як цэнтральныя і ўсе нізавыя арганізацыі змогуць, пакладзшы ў аснову работы 6 умоў тав. Сталіна, забясьпечыць апэрацыйнае кіраўніцтва ўсёй кампаніяй.

Правільная арганізацыя працы на аснове зьдзельшчыны будзе зьяўляцца рашаючай як у вырашэньні праблемы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, так і пасьпяховага правядзеньня пасеўнай. На гэты вучастак павінна быць пакіравана ўвага ўсёй партыйнай арганізацыі.

Разам з тым трэба перамагчы існуючую недаацэнку плянаваньня ў калгасах. Вытворча-фінансавы план у гэтым годзе павінен забясьпечыць поўнасьцю і ў тэрмін выкананьне ўсіх заданьняў партыі і ўраду, забясьпечыць правільную расстаноўку рабочай сілы, пакласьці канец абязьлічцы і пакласьці адказваць задачам барацьбы за якасьць. У гэтым яго сіла. План павінен пакласьці пачатак увядзеньню правільных севазваротаў, якія-б адказвалі задачам далейшай спэцыялізацыі і ўсім іншым аграмерапрыемствам, якія спрыяюць павышэньню ўраджайнасьці.

МТС, як вагар арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, ва ўсёй падрыхтоўчай рабоце павінна заняць адно з першых месц. Сваячасовае правядзеньне дагаворнай кампаніі з калгасамі, дапамога калгасам пры складаньні плянаў, арганізацыі працы на аснове зьдзельшчыны і г. д. — павінны стаяць у цэнтры ўвагі.

Задача ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый, вясковых ячэек і кожнага камуніста — забясьпечыць належнае кіраўніцтва падрыхтоўчай работай. Дабіцца таго, каб пастанова ЦК КП(б)Б і СНК аб веснавой пасеўнай кампаніі стала здабыткам шырокіх мас калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў. Неадкладна разгарнуць шырокую масавую работу, скарыстаўшы для гэтай мэты ўсе сродкі. Сваячасова давесьці пляны пасеву да кожнага калгасу і вёсак.

Адначасова асаблівую ўвагу зьвярнуць на работу сярод аднаасобнага сэктару, які займае даволі значнае месца па пасеўнай плошчы. Недаацэнка масавай работы сярод бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў будзе граць толькі на руку клясаваму ворагу, які імкнецца сарваць падрыхтоўку да пасеўнай.

Толькі ў рашучай барацьбе з усімі апартуністычнымі элемэнтамі, якія будуць прабаваць даказаць нерэальнасьць плянаў, у барацьбе з самапёчнымі настроямі і кулаком, разгортваючы шырокае сацыялістычнае спаборніцтва паміж саўгасамі, калгасамі і вёскамі па лепшую падрыхтоўку — мы забясьпечым баявую сустрэчу трэцяй бальшавіцкай вясны.

Лепшым завяршэньнем збожжазагатовак да XIV зьезду КП(б)Б

заваяваць пяршынства ва ўсебеларускім конкурсе

14 СТУДЗЕНЯ

Другая пяцідзёўка студзеня дала такія-ж **нездавальняючыя** вынікі ў збожжазагатоўках, як і першая пяцідзёўка. На 10 студзеня галавы плян па рэспубліцы выкананы **толькі на 79,6 проц.** Прырост за пяцідзёўку складае ўсяго 1,1 проц. Па калгасным сэктары план выкананы на 96 проц. (прырост 1,2 проц.), па аднаасобным — на 70,2 проц. (прырост 0,9 проц.).

Гэтыя лічбы выразна сьведчаць, што ў большасьці адсталых раёнаў усё яшчэ няма неабходнага пералому ў ходзе збожжазагатоўчай кампаніі, усё яшчэ не разгорнуты сапраўды ўдарныя тэмпы работы якія-б забясьпечылі выкананьне і перавыкананьне плянаў да XIV зьезду КП(б)Б. Між тым, да адкрыцьця зьезду засталіся лічаныя дні.

Аналіз зводкі ў сэктарыяльным разрэзе паказвае, што самым адсталым вучасткам збожжазагатовак усё яшчэ застаецца **аднаасобны сэктар.** Гэта вынік слабай, а месцамі поўнай адсутнасьці масава-палітычнай работы сярод беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў, падмены гэтай работы ў радзе выпадкаў грубым адміністраваньнем і недапушчальна слабага націску на кулацка-заможныя элемэнты. Гэтыя правыя і «левыя» скажэньні палітычнай партыі ў загатоўках павінны атрымаць зьнішчальны адпор з боку ўсіх партарганізацый.

Перадавыя калгасы, сельсаветы і раёны ідуць зараз пад сьцягам барацьбы за завяршэньне збожжазагатовак да XIV зьезду КП(б)Б. У гэтых калгасах, сельсаветах і раёнах разгорнута шырокая работа па правядзеньні дэкадніка штурму збожжазагатовак, па мабілізацыі шырокіх мас калгасьнікаў і аднаасобнікаў на барацьбу за пяршынства ва ўсебеларускім конкурсе на лепшае завяршэньне збожжазагатовак.

З кожным днём растуць рады пераможцаў па збожжазагатоўчым фронце. Сёньня мы друкуем рапарты **Лёзьнянскага і Мсьціслаўскага** раёну аб поўным скончэньні здачы збожжа. Гэтыя раёны высунулі **сустрэчныя** пляны і зараз падрыхтоўваюць усю работу задачы ажыцьцяўленьня сустрэчных да XIV зьезду.

На перадавікох павіны раўняцца ўсе адсталыя раёны БССР. У бліжэйшыя дні яны абавязаны поўнасьцю ліквідаваць запазычанасьць дзяржаве, заваяваць права на рапарт XIV зьезду КП(б)Б.

Чырвоны абоз—у падарунах райпартканфэрэнцыі

МАГІЛЕЎ (БЕЛТА)

АПОШНІЯ ДНІ АДЗНАЧАНЫ МАСАВАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ ПА РАЁНЕ ЧЫРВОНЫХ АБОЗАЎ СА ЗБОЖЖАМ І ІНШАЙ ПРАДУКЦЫІЙ. ПЕРАДАВЫЯ КАЛГАСЫ І СЕЛЬСАВЕТЫ ПАДЫХОДЗЯЦЬ ДА РАЙПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ І XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б З ВЫКАНАНЬНЕМ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕМ ЗАДАНЬНЯЎ ПА ЗДАЧЫ ЗБОЖЖА І ВЫСОЯВАЮЦЬ І СУСТРЭЧНЫЯ ПЛЯНЫ. ЦІШАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ ЗДАЎ ЗВЫШ ПЛЯНУ 50 ЦЭНТН. ЗБОЖЖА. КАЛГАСЫ «НОВЫ СЬВЕТ», «САЦЫЯЛІЗМ» І «1 МАЯ», КНЯЗЕЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, АРГАНІЗАВАЛІ ЧЫРВОНЫ АБОЗ І ЗДАЛІ ЗВЫШ ПЛЯНУ 42 ЦЭНТН. ЗБОЖЖА. У ГОНАР РАЙПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ КНЯЗЕЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ РЫХТУЕ ЧЫРВОНЫ АБОЗ СА ЗБОЖЖАМ І ІЛЬНАВАЛАКНОМ.

9-ГА СТУДЗЕНЯ Ў МАГІЛЕЎ ПРЫБЫЛІ ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ З КАЛГАСАЎ МАСТОЦКАГА І МАШАНАЦКАГА СЕЛЬСАВЕТАЎ.

Гадавы плян перавыканан

МСЬЦІСЛАЎЕ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

ГАДАВЫ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК У КОЛЬКАСЬЦІ 2.750 ТОН ПА МСЬЦІСЛАЎСКІМ РАЁНЕ ВЫКАНАН З ПЕРАВЫШЭНЬНЕМ НА 57 ТОН — 102,1 ПРОЦ. КАЛГАСЬНІКІ І АДНААСОБНІКІ МСЬЦІСЛАЎШЧЫНЫ ВЫСУНУЛІ СУСТРЭЧНЫЯ ПЛЯНЫ ЗДАЧЫ ЗБОЖЖА Ў РАЗЬМЕРЫ ЗВЫШ 400 ТОН.

МАБІЛІЗОВАН УВЕСЬ ПАРТЫЙНЫ АКТЫЎ НА ВЫКАНАНЬНЕ СУСТРЭЧНЫХ ПЛЯНАЎ ДА XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б.

НАМ. САКРАТАРА РК КП(б)Б ВАЙНШТЭЙН.

Прысьці да XIV партзьезду з рашаючай перамогай на фронце ільназагатовак—справа гонару кожнага раёну, сельсавету, калгасу

47,9 проц.

Ільназагатоўкі ўсё яшчэ праходзяць вельмі нездавальняюча. Апошняя пяцідзёўка не дала амаль нічога зруху. На 11 студзеня плян выкананы усяго на 47,9 проц. супроць 46,2 проц. па 5 студзеня.

Большасьць ільнаводчых раёнаў усё яшчэ даюць вельмі нізкія паказьнікі загатовак тэхкультур. Так, **Дубровенскі** раён выканаў плян усяго на 32,7 проц., **Полацкі**—32,4 проц., **Талачынскі** — 39,7 проц., **Шклоўскі** — на 40,9 проц., **Асьвейскі** — 32,5 проц., **Гарадоцкі** — на 47,5 проц., **Горацкі** — 33 проц., **Расонскі** —32,9, **Сурасскі** — 52,4, **Чавускі** — 37, **Вушацкі** — 39,7, **Крупскі** — 26,7, **Сіроцінскі** — 45,9 і г. д.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што лён асядае на месцы. Некаторыя раённыя і мясцовыя арганізацыі і работнікі праяўляюць апартуністычную недаацэнку важнасьці сваячасовага і поўнага выкананьня плану ільназагатовак, спадзяючыся, што лён пойдзе самацёкам, і не даюць адпору кулацка-рвацкім тэндэнцыям у паасобных калгасах.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у пастанове аб ходзе ільназагатовак адзначылі, што адзіф з асноўных прычын адставаньня зьяўляецца аслабленьне тэмпаў **апрацоўкі** ільну і пянькі.

Наркамзему, Калгасцэнтру, райкомам партыі і райвыканкомам было прапанавана «безадкладна праверыць выкананьне заданьняў па перапрацоўцы ільну, канапель і зімняга расьпілу ільну, узяць над спэцыяльны нагляд адстаючыя калгасы і насяленьні, дабіваючыся ліквідацыі прарыву на адстаючых калгасах і насяленьнях у дзесяцідзённы тэрмін».

Гэта дырэктыва партыі і ўраду павінна быць неадкладна рэалізавана. Тэмпы ільназагатовак трэба крута ўзьняць уверх, раўняючыся па перадавікох.

Прыйсьці да XIV зьезду КП(б)Б з перамогай на ільназагатоўчым фронце — справа гонару кожнага раёну, сельсавету, калгасу.

15 калгасаў скончылі здачу ільну

ШКЛОЎ. (Наш кар.).

Шклоўшчына ў цэлым усё яшчэ адстае ў разгортваньні ільназагатовак. Аднак, рад калгасаў паказваюць узор выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай. Так, 15 калгасаў перавыканалі ўжо свае заданьні. Да гэтых калгасаў адносяцца: «Ударнік» № 1, які выканаў плян на 146 проц.; «Чырвоны ўдарнік» — на 125 проц., імя Галадзеда — на 135 проц., «Новы быт» — на 102 проц., імя Лупачарскага — 107,7 проц., імя Молатава — 99,4 проц., «Чырвоны цягнік» —105 проц., імя Калініна — 125,7 проц., «Завет Ільліча» — 111,5 проц., «Прамень камуны» — 118 проц., імя Будзённага — 95,2 проц., «Чырвоная зьмена» — 105 проц., «Княжыцы» — 111 проц. і г. д.

Гэтыя посьпехі дасягнуты калгасамі на аснове ўвядзеньня сапраўднай зьдзельшчыны, наладжаньня дакладнага ўліку і разгортваньня сацыяльнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Практыку гэтых перадавікоў раённыя арганізацыі абавязаны зрабіць здабыткам усіх адстаючых калгасаў. **Трэба шырока разгарнуць сацыялістычны бусьпір і калгасную ўзаемадапамогу.**

НОВІКАЎ.

Самацёк і бязьдзейнасьць

ТАЛАЧЫНО. На 5 студзеня плян загатовак ільнавалакна выкананы толькі на 36,9 проц.

Калгасны сэктар выканаў сваё заданьне на 50,4 проц. Адставаньне тлумачыцца галоўным чынам дрэннай арганізацыяй апрацоўкі ільну ў радзе калгасаў (імя Мархлеўскага, Красіна, Кона, «Новы быт»).

Рабочая сіла ў значнай частцы калгасаў скарыстоўваецца дрэнна. Брыгады па апрацоўцы ільну на работу выходзяць позна — у 11-12 гадзін і працуюць ня больш 4-5 гадзін. Прагрэсыўная зьдзельшчына ўжываецца рэдка. Нормы выпрацоўкі ў радзе калгасаў ня выконваюцца.

Разгортваньне апрацоўкі затармазіла і тое, што сушыльна-мяльныя пункты сваячасова ня былі падрыхтаваны.

Зусім выпаў з-над увагі раённых арганізацый аднаасобны сэктар, які выканаў сваё заданьне на 11,5 проц. Цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных двароў спагнаны ўсяго на 14,7 проц.

Талачынскія арганізацыі абавязаны неадкладна на-баявому пераключыцца на лён, мабілізуючы масы на бальшавіцкае выкананьне плану, па-ладу ліквідуючы недахопы ў арганізацыі ільнапрацоўкі. З апартуністычным самацёкам, з палітычнай недаацэнкай аднаасобнага сэктару трэба рашуча пакончыць.

Д.

Смалявіцкі раён уключыўся ў конкурс

У бліжэйшыя-ж дні ліквідаваць адставаньне

СМАЛЯВІЧЫ. (Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).

Смалявіцкі раён — адзін з адсталых раёнаў рэспублікі па збожжазагатоўках. На 1 студзеня галавы плян быў выкананы толькі на 77,1 проц. За прайшоўшую дэкаду загатоўлена зусім нязначная колькасьць збожжа. Прырост за 10 дзён складае 0,4 проц. гадавога пляну.

Такія нізкія тэмпы загатовак тлумачацца тым, што паасобныя раённыя арганізацыі, сельсаветы і работнікі праяўляюць дэмабілізацыйныя настроі, недаацэньваюць важнасьці поўнага і найхутчэйшага скончэньня збожжазагатоўчай кампаніі. Вось характэрны прыклад. Райвыканкам асьветы **Парамон** у выступленьні на нарадзе раённага актыву заявіў: «Недавыкананьне пляну збожжазагатовак на 23 проц. — зусім нармальнае зьявішча».

Асабліва дрэнна йдуць загатоўкі па **Кляніцкім** сельсавеце, які выканаў заданьне толькі на 57,8 проц. **Юраўскім** — 58,1 проц., **Прылепскім** — 59,2 проц.

Некаторыя сельсаветы адносяцца прымірэнча да кулацкага сабатажу збожжазагатовак, ня прымаюць ніякіх мер да спагнаньня цьвёрдых заданьняў. Па **Кляніцкім** сельсавеце цьвёрдыя заданьні спагнаны на 16.8 проц., **Варатоўскім** — на 48 проц., **Слабодзкім** — 52 проц. і г. д.

За апошнія дні намеціўся пэўны зрух у бок узмацненьня збожжазагатовак. **Смалявіцкі раён уключыўся ва ўсебеларускі конкурс на лепшае завяршэньне збожжазагатоўчай кампаніі, абвешчаны Наркамзнабам БССР і «Зьвяздой». Райвыканкомам і раённай газэтай «Шлях калектывізацыі» абвешчан конкурс паміж сельсаветамі раёну на хутчэйшае і пасьпяховае скончэньне здачы збожжа. Вызначаны тры прэміі ў 200, 100 і 50 рублёў.**

11 студзеня адбылася нарада партыйнага, прафэсыянальнага і грамадзкага актыву раёну, на якой абгаворвалася на адозва калгасьнікаў і аднаасобнікаў Уваравіцкага раёну аб збожжазагатоўках. **Нарада абвясьціла сябе мабілізаванай на ўдарнае правядзеньне дэкадніка штурму збожжазагатовак і выслухала сустрэчны плян у 500 тон, які абавязалася выканаць да XIV зьезду КП(б)Б.**

У сельсаветы і калгасы накіравана 36 адказных раённых работнікаў. Ужо атрыманы першыя весткі з паасобных сельсаветаў аб гэтамчэньні тэмпаў работы. **Смалявіцкі сельсавет выканаў заданьне на 100 проц. і выслухаў сустрэчны плян на 20 проц. Сельсавет узяў на буксір адстаючы Забалоцкі сельсавет, куды паслаў штурмавую ўдарную брыгаду.**

Смалявіцкі раён можа і павінен з посьпехам завяршыць збожжазагатоўкі да XIV зьезду КП(б)Б. Для гэтага патрэбна толькі бальшавіцкая настойлівасьць, выразнае апэрацыйнае кіраўніцтва, мабілізацыя шырокіх мас калгасьнікаў і аднаасобнікаў на барацьбу за выкананьне і перавыкананьне пляну.

К-к.

Сваячасовае разьмеркаваньне даходаў—

важнейшы вагар у падрыхтоўцы да трэцяй бальшавіцкай вясны

Заўтра апошні тэрмін

Разьмеркаваньне калгасных даходаў па колькасьці і якасьці працы адыгрывае вялізарнае гаспадарча - палітычнае значэньне ў арганізацыі калгаснай вытворчасьці.

Сваячасовае разьмеркаваньне ўраджаю выключна па працаднёх умацоўвае зьдзельшчыну, узьнімае прадукцыйнасьць працы, стварае магчымасьці для ўзьняцьця на вышэйшую ступень сацыялістычнага спаборніцтва.

«Лявацкая» ўраўніўка аслабляе працоўную дысцыпліну сярод калгасьнікаў, тармозіць арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, грае на руку клясаваму ворагу—кулаку.

Вось чаму партыя дамагалася і дамагаецца скончыць канчатковае разьмеркаваньне выключна па прыцыпе—хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае — у вызначаны партыяй тэрмін — да 15 студзеня.

Аднак, паводле вестак Белкалгасцэнтру, па 10 студзеня па 44 раёнах склалі пляны разьмеркаваньня 93 проц. калгасаў, зацьвердзілі гэтыя пляны на агульных сходах калгасьнікоў 82 проц., выпалі натурай % частка ўраджаю толькі 87 проц. калгасаў, з колькі правілі канчатковае разьмеркаваньне — Белкалгасцэнтр ня ведае.

Пастанова Калгасцэнтру СССР аб стварэньні брыгад з калгаснага актыву на праверцы папярэдніх праектаў разьмеркаваньня ня ўсімі раённымі арганізацыямі выканана. Як паведамляюць нашы рабселькоры са Смалявіцкага, Капыльскага і Бешанковіцкага раёнаў, адсутнасьць праверкі прывяла да таго, што на некаторых калгасах пры разьмеркаваньні ўсё яшчэ квітнее «лявацкая» ўраўніўка.

З разьмеркаваньнем калгасных даходаў марудзіць нельга. Затрыманьне разьмеркаваньня тармозіць падрыхтоўку калгасаў да трэцяй бальшавіцкай вясны. Заўтра — 15 студзеня—апошні тэрмін. Заўтрашні дзень зьявіцца днём баявой праверкі для кожнай партарганізацыі, кожнай зямельна-калгаснай сыстэмы, наколькі яны па-бальшавіцку выканалі адну з важнейшых дырэктыў партыі—канчатковае разьмеркаваньне даходаў па працаднёх да 15 студзеня.

125 калгасаў ураджаю не разьмеркавалі

БЕШАНКОВІЧЫ. У раёне налічваецца 248 калгасаў. Папярэдняе разьмеркаваньне ўраджаю скончана ў 123 калгасах. На праўленьні райкалгасаюзу заціьвердкана 98 праектаў. Што робіцца ў іншых калгасах — раённыя арганізацыі ня ведаюць. Да выпраўленьня памылак (ураўніўка, зьмяшэньне непатрэбных фондаў, няправільнае налічэньне працадзён), якія дапушчаны паасобнымі калгасамі, райкалгасаюз не прыступіў. Да канчатковага разьмеркаваньня ніякай падрыхтоўкі не вялося.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што разьмеркаваньне даходаў па працаднёх у Бешанковіцкім раёне зрываецца. Яно да 15 студзеня не будзе скончана. Райком КП(б)Б павінен зрабіць адпаведныя арганізацыі ў адносінах да райкалгасаюзу, які не забясьпечыў выкананьня важнейшай дырэктывы партыі.

П.

Раўняцца па калгасе імя Максіма Горкага

МСЬЦІСЛАЎЕ. У раёне ажыцьцяўляецца пастанова Калгасцэнтру СССР аб праверцы разьмеркаваньня даходаў у калгасах. Па ўсіх сельсаветах былі створаны брыгады з калгасьнікаў і партыйна-камсамольскага актыву. Брыгада аднаго калгасу рабіла праверку разьмеркаваньня ў другім калгасе. Работа самазадзёйных брыгад дала значныя рэзультаты ў сэнсе выпраўленьня дапушчаных скажэньняў, хутчэйшага выкананьня пляну загатовак.

Вось вынікі аглядзіны калгасу імя Максіма Горкага, Янаўскага сельсавету. Калгас плян загатовак выканаў і перавыканаў па ўсіх відах: збожжа замест 10 тон здала 11 тон, ільнавалакна замест 33 цэнт. — 40 цэнт. і г. д. Створаны насенны і кармовы фонды. Есьць спэцыяльны харчовы фонд для адыходнікаў, сем'і якіх забясьпечваюцца пароўні з сем'ямі добрасумленных калгасьнікаў. На кожны працадзень прыпадае збожжа 4 кілё, бульбы—7 кілё, ільнавалакна—500 грам і г. д.

Ураджай разьмяркован выключна па колькасьці і якасьці працы, затрачанай кожным калгасьнікам. Канчатковае разьмеркаваньне рабілася на агульным калгасным сходзе, на якім прысутнічалі беднякі і сераднякі — аднаасобнікі. Па калгасе імя Максіма Горкага павінны раўняцца іншыя калгасы.

С. Карказінаў.

Парушаецца асноўны прынцып

СМАЛЯВІЧЫ. (БЕЛТА).

У радзе калгасаў пры разьмеркаваньні даходаў і ўраджаю ўпруба парушаецца асноўны прынцып — «хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае». У калгасе «Чырвоны пуцілавец» праўленьне на чале са старшынёй Кулінковічам дапусьціла ідэйную ўраўніўку. Калгасьнік Мажойка пакінен быў атрымаць згодна выпрацаваных працадзён, 65 кгр. ячменю, а сапраўды атрымаў у 3 з паловай разы больш — 230 кгр.

Гэты факт не зьяўляецца адзіным. Каля 60 проц. калгасьнікаў атрымалі або больш або менш, чым ім належыць паводле выпрацаваных норм.

Райкалгасаюз яшчэ ня ўжыў ніякіх крокаў, каб выправіць дапушчаныя скажэньні пры разьмеркаваньні ўраджаю.

ДАЦЬ БЕЛДРЭС АПАЛІ

Дапамагчы торфазаводу „Бальшавік" вывезьці торф з балота

З кожным днём зьмяншаецца порцыя торфу, якую прывозяць маленькія паравозікі з Асінаўскага балота. З кожным днём усё ніжэй і ніжэй становіцца зьбіраць гэты торф, раскіданы невялікімі кучкамі на вялізарнай тэрыторыі Асінторфу. Каб падтрымаць патрэбны націск у катлох, работнікі станцыі робяць гераічныя намаганьні. Выпадкова атрыманая нафта выдаткоўваецца з вялікай эканоміяй. Прыбізна адна трэцяя прывознага «імпартнага» торфу ўжо выедзена пражорлівымі топкамі станцыі. Бліжэйшыя 6-7 дзён будуць **рашаючымі.** Трэба ўсімі сіламі фарсаваць вывазку і дастаўку торфу з іншых балот, даводзячы штодзённую нагрузку **мінімум да 90 вагонаў.**

Між тым, рашучага пералому ў дастаўцы торфу яшчэ няма. Праўда, крыху ідзе ўгару: 8 студзеня атрымана 5 вагонаў, 9-га — 15 вагонаў, 10-га — 33, але гэтага мала.

З іншых торфазаводаў буйнейшым пастаўшчыком Белдрэсу зараз зьяўляецца торфазавод «Бальшавік» (Касьцюкоўка, Гомельскага раёну). Апрача заключанага дагавору на водпуск 10.000 тон, вядуцца перагаворы аб дадатковых 7.000 тон. Але ўвесь гэты торф яшчэ ляжыць на балоце. Яго трэба вывезьці. Пракладка вузкакалейкі на балоце на адлегласьці 8 кілёмэтраў, пачатая Шклабудам, ідзе вельмі марудна. **Не хапае рэек, накладак, кастыляў, людзей.**

Белдрэсу ўдалося дабіцца ад Белторфу распараджэньня—перакінуць на «Бальшавік» 90 тон павінен даць торфазавод імя **Гея** (Смалявічы), столькі-ж — «Міхапавічы» і 54 тоны — Асінторф.

Але на Асінторфе працуе яшчэ Белавусаў, які зьнімаецца з работы за правал торфаздабычы мінулага сэзону і пежаданьне працаваць і кіраваць па-новаму, Белавусаў на разьвітаньне нарашыў сарваць адпраўку рэек, наперакор катэгарычнаму загаду Белторфу. Даведаўшыся ад прадстаўніка Белдрэсу, што на 10 студзеня заказаны 3 плянформы, Белавусаў заявіў, што **ён грузіць не дазволіць,** што рэйкітрэба раней рассартаваць і гэта зойме **ня менш 3-х дзён.**

НА РАЁННЫХ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯХ

Пад сьцягам бальшавіцкай непрымірымасьці

ДА ЎСЯКІХ СПРОБ РЭВІЗАВАЦЬ ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ ПРАХОДЗЯЦЬ РАЁННЫЯ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ

Агонь па кулацкай агентуры

Жлобінская райпартканфэрэнцыя закончыла свае работы. Канфэрэнцыя паказала, што партыйныя арганізацыі за апошні год нашто больш згуртаваліся вакол ЦК КП(б)Б і ЦК УсеКП(б), што партыйная арганізацыя значна вырасла ідэйна і арганізацыйна.

За мінулы перыяд партарганізацыя на аснове непрымірымай барацьбы супроць усякіх ухілаў ад лініі партыі, узмацніла паўных посьпехаў.

Жлобінскі чыгуначны вузел, які ўваходзіць адным з буйнейшых вузлоў чыгуначнага транспарту БССР, набыў некаторага павышэньня тэмпаў сваёй работы. Рабочыя-чыгуначнікі ўвялі прадукцыйнасьць працы на 109.8 проц. і зьнізілі сабекошт на матар'ялах — на 24.4 проц. і па рабсіле — на 13,8 проц. Сацыялістычным спаборніцтвам ахоплена 90 проц. ўсіх рабочых. Рабочыя дзяо ўкрамзата далі звыш плану 9 паравозаў.

У галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі партарганізацыя дабілася таго, што сацыялістычны сэктар займае 34 проц. За мінулы год арганізаваны два новыя саўгасы на плошчы 5.225 га. Арганізавана 18 МТФ і 30 СТФ, пабудаваны вёска-птушачны камбінат. Праўда слаба яшчэ праводзіцца работа па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Жлобінскі раён пераканучальна адстаў у правядзеньні асноўных гаспадарча-палітычных кампаній і ў першую чаргу па загатоўках. Да часу кан[illegible] плян збожжазагатовак у раёне выкананы толькі на 65 проц. і па мяснозагатоўках — на 51.3 проц. Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што партыйная арганізацыя не мабілізавала жыв калгасьнікаў на барацьбу з кулацка-стяжыцкімі тэндэнцыямі, не разгарнула палітычна-масавай работы вакол загатовак.

Канфэрэнцыя пастанавіла дабіцца выкананьня перакому ў хоўце загатовак з тым, каб да XIV зьезду КП(б)Б гэрэсці з поўным выкананьнем намечаных загатоўчых планаў.

Партыйныя ячэйкі раёну за мінулы год прынялі ў свае рады каля 200 чал. перадавых рабочых-ударнікаў і лепшых калгасьнікаў-актывістаў. Канфэрэнцыя заваструла ўвагу ўсёй арганізацыі на разгортваньне марксыцка-ленінскага выхаваньня, асабліва вострага паўтаўненьня партыйных радоў.

Па канфэрэнцыі мела месца антыпартыйная вылазка апартуністаў. Член парт'ячэйкі дзяо Сычаўка ў сваім выступленьні па дакладу ЦК КП(б)Б узяў пад сумненьне правільнасьць палітычнай лініі ЦК, імкнуўся рэвізаваць генэральную лінію партыі. Выступаючы ў другі раз па справаздачы райкому, гэты-ж самы Сычаўка ўзводзіў паклёпы на праф саюзы, адмаўляючы іх вялізарную ролю ў разгортваньні сацыялістычнага будаўніцтва. У сваёй далейшай прамове Сычаўка прабаваў даказаць, што «лявацкія» загібы, якія мелі месца ў некаторых пізавых зьвяньнях васковых партарганізацый зьяўляюцца рэзультатам няправільнасьці палітыкі партыі і ЦК на вёсцы.

Партыйная канфэрэнцыя выступленьню гэтага кулацкага агента дала жорсткі адпор і аднагалосна вывела са складу дэлегатаў.

Канфэрэнцыя па дакладу тав. ІВАНОВА адназушна ўхваліла палітычную лінію ЦК КП(б)Б, прызнала яе абсалютна правільнай.

На сваім пачарговым сходзе парт'ячэйка дзяо разглядзела пытаньне аб антыпартыйнай выразе Сычаўкі. Парт'ячэйка дала гэтаму выступленьню адпаведную палітычную ацэнку і пастанавіла выключыць яго з радоў КП(б)Б.

На ўсякія спробы апартуністаў рэвізаваць генэральную лінію партыі, парт'ячэйка адказала павышэньнем свайго змаганьня за новыя вытворчыя перамогі. Да XIV зьезду КП(б)Б, ячэйка абавязалася адпрацаваць адзін паравоз пад'ёмачным рамонтам і два паравозы галоўнай прамыўкай.

Партыйная канфэрэнцыя Жлобінскага раёну яшчэ больш мабілізавала арганізацыю на барацьбу з усякімі ўхіламі ад лініі партыі, на барацьбу супроць прыхільнікаў ліквідацыі і скажэньняў партыйнай лініі.

В. С.

Рэалізацыю 6-ці ўмоў т. Сталіна— у цэнтр увагі

Пэрыяд ад 1-й да 2-й гаршанскай партканфэрэнцыі характарызуецца радам посьпехаў у рабоце раённай партыйнай арганізацыі на важнейшых участках сацыялістычнага будаўніцтва. За гэты пэрыяд пушчаны ў ход ільнакамбінат, мясакамбінат, пабудаваны сілікатны завод. Колькасьць рабочых павялічылася больш чым у два разы і зараз перавышае 4 тыс. Вышэйшая валавой прадукцыі павялічыўся на 124 проц.

Разам з тым канфэрэнцыя адзначыла шмат недахопаў у рабоце прамысловасьці. У той час, калі металапрацоўчая, кахольная і інш. галіны прамысловасьці з посьпехам выканалі вытворчую праграму 3-га рашаючага году пяцігодкі, гарфанная прамысловасьць выканала свой плян толькі на 77.4 проц., дрэваапрацоўчая — на 77.9 проц., а цэгельная—на 40 проц. Вельмі дрэнна стаіць справа з выкананьнем якасных паказальнікаў.

Канфэрэнцыя асаблівую ўвагу аддала становішчу работы на Асінторфе ў БелДРЭС. Па гэтых прадпрыемствах назвычай шмат недахопаў. Перабоі ў рабоце БелДРЭС вельмі дрэнна адбіліся па рабоце прамысловасьці. Запасу торфу па БелДРЭС хопіць толькі на некалькі дзён. Такое становішча тлумачыцца тым, што кіраўніцтва Асінторфу і БелДРЭС аказаліся шкодзьнымі справіцца з пастаўленымі перад імі задачамі. Партыйная арганізацыя і гаспадарчае кіраўніцтва не перабудавалі работы. Набор рабочай сілы на торфаразпрацоўкі праходзіў у значнай меры самацёкам. Не адзавалася ўвага правае матар'яльна бытавога абслугоўваньня рабочых. У зарплаце яшчэ і да гэтага часу ня зьнішчана ўраўнілаўка, вельмі мала зроблена ў адносінах ліквідацыі абязьлічкі. Зразумела, што за такое становішча ня зьмяшчаюць адказнасьць з раённага парткіраўніцтва, якое слаба займалася справай правільнай пастаноўкі работы на гэтых важнейшых прадпрыемствах.

Канфэрэнцыя абмеркавала даклад па чальцыка 3-га чыгуначнага раёну аб рабоце Аршанскага вузла. Вузел за апошні год значна папыраўся. Колькасьць рабочых чыгуначнікаў павялічылася на 50 проц. Тым ня менш, у рабоце вузла ёсьць яшчэ шмат недахопаў. Зрывы спаравай язды ў сьнежні складалі 7 проц., процант хворых паравозаў раўняецца 14.6 проц., ня выканана норма сярэдня-сутачнага прабегу таварнага паравоза, дрэнна працуе абменны пункт і г. д.

Канфэрэнцыя мабілізавала рабочую партарганізацыю на бальшавіцкае змаганьне за поўную рэалізацыю 6 умоў т. Сталіна, што зьяўляецца асноўным у забесьпячэньні пасьпяховага выкананьня вытворчай праграмы 4-га заключнага году пяцігодкі і ўзьняцьці работы чыгуначнага вузла на вышэйшую тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

У раёне калектывізавана 67 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Пабудавана МТС, электрыфікавана 10 калгасаў і некаторыя саўгасы. Слаба яшчэ праводзіцца работа раённай парт арганізацыі па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Толькі ў 20 калгасах увядзена сапраўдная зьдзельшчына. Далёка не ва ўсіх калгасах палажэнні улік працы. Рад парт'ячэек слаба кіруюць работай па разьмяшчаньні ўраджаю і даходаў у калгасах. У Межаўскай, Пугуляўскай і Шчыбецкай парт'ячэйках мелі месца праўцюленьні апартуністычнай практыкі. Калгасы, якія абслугоўваюцца гэтымі ячэйкамі, засьмечаны кулацкім элементам.

Аршанская партарганізацыя за справаздачны пэрыяд вырасла на 44,7 проц. Рост праходзіў пераважна за лік лепшай перадавой часткі рабочых з вялікім вытворчым стажам. Трэба адзначыць, што марксыцка-ленінскае выхаваньне камуністаў і асабліва новага папаўненьня стаіць не на належнай вышыні. Ахоплена згодна даных РК. сеткай партасьветы 76 проц. склату партарганізацыі. На справе-ж калі прынять пад увагу пропае наведваньне заняткаў слухачамі, гэты процант значна ніжэйшы. 20 проц. кандыдатаў не ахоплены ніякімі відамі вучобы. Задача ўзмацненьня барацьбы супроць ухілаў ад генэральнай лініі партыі, супроць трацкісцкай контрабанды і гнілога лібералізму, задачы палепшэньня якасьці работы на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць узьняцьця справы марксыцка-ленінскага выхаваньня на вышэйшую ступень.

Р. П.

Адзінадушна ўхваляюць палітычную лінію ЦК КП(б)Б

10-га студзеня адкрылася 2-я Дрысенская раённая партканфэрэнцыя. Пад бурныя воплескі выбраны ў ганаровы прэзыдыум ПАЛІТБЮРО ЦК УсеКП(б) і т. т. ЛЕНСКІ, ГЕЙ, ШАРАНГОВІЧ.

З прывітаньнем ад імя ўдарніка пагранатраду выступалі тав. Васільлеў і дэлегат акруговай партканфэрэнцыі пограшаховы і войск АДПУ тав. Казакоў, якія запэўнілі канфэрэнцыю ў тым, што чырвоныя пагранічнікі стойка і пільна стаяць на варце савецкай мяжы, на варце сацыялістычнага будаўніцтва.

Дэлегаты раду калгасаў рапартавалі аб сваіх перамогах у выкананьні чарговых гаспадарча-палітычных задач і разгортваньні шырокай падрыхтоўчай работы да правядзеньня 3-й бальшавіцкай вясны.

Перадана прэзыдыуму 251 руб. на пабудову дырыжабля.

Рабочыя ільназаводу рапартавалі аб перавыкананьні імі прамфінпляну. Дэлегаты 3-га дарожнага вучастку і аўтакалёны перадалі канфэрэнцыі чырвоны сьцяг.

Канфэрэнцыя паслала прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, кампартыям Польшчы, Заходняй Беларусі, Латвіі, «Правде» і «Зьвязде».

Па вячэрнім пасяджэньні са справаздачай ЦК КП(б)Б выступіў тав. Дунец. Канфэрэнцыя адзінадушна ўхваліла палітычную лінію ЦК КП(б)Б.

„Калгасьніку Беларусі"

Бальшавіцкае прывітаньне ў дзень 11-гадовага юбілею!

Пэрыяд сацыялізму прад'яўляе партыйна-савецкаму друку надзвычай адказныя патрабаваньні. Друк пастаўлен партыяй на аванпасты сацыялістычнага будаўніцтва.

12-ты год работы «Калгасьніка Беларусі» павінен стаць годам яшчэ больш настойлівай барацьбы за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, барацьбы з правым і «левым» апартуністамі, з вялікадзяржаўным і беларускім нацыянал-апартуністамі і прымірэнцтвам да іх.

Максымум увагі арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў — гэтай цэнтральнай праблеме калгаснага будаўніцтва. Яшчэ шчыльней падмысьці да выканьня спецыялізацыі сельскай гаспадаркі, поўнасьцю аўладаць тэхнікай жывёлагадоўлі і ільнаводзтва. Штодзенна змагацца за ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна ў сельскай гаспадарцы.

Такавы асноўныя задачы, вакол якіх павінны быць сканцэнтраваны сілы рэдакцыйнага калектыву.

«Зьвязда» ўпэўнена, што «Калгасьнік Беларусі», замацоўваючы свае посьпехі, будзе ў першых радах змагароў за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, за пабудову сацыялізму.

РЭДАКЦЫЯ «ЗЬВЯЗДЫ».

Работнікі мэдыцыны ўключыліся ў падрыхтоўку да партыйнага зьезду

Да ўсіх работнікаў мэдычнага фронту БССР

Рабочая кляса Савецкай Беларусі з удзесяцярэнай энэргіяй сустракае падыходзячы XIV зьезд КП(б)Б і XVII усесаюзную партканфэрэнцыю.

Пралетарыят і калгаснае селяцтва, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК і правадыра нашай партыі тав. Сталіна, за час паміж XVI зьездам і XVII канфэрэнцыяй УсеКП(б) дабіліся вячэрнавых у гісторыі посьпехаў, пяўхільна праводзячы разгорнутае наступленьне на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва.

Адначасова з ростам прамысловасьці і сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі расьце колькасьць рабочай класы, паляпшаецца матар'яльнае і культурна - бытавое становішча працоўных Савецкага Саюзу, у тым ліку і працоўных БССР.

Карэнным чынам зьмяніліся суадносіны клясавых сіл у краіне. Калгасьнік стаў цэнтральнай фігурай краіны буйнейшага зьмяроўства. На базе суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца апошняя апора капіталізму ў нашай краіне—кулацтва як кляса.

Органы аховы здароўя, забясьпечваючы пасьпяховае выкананьне прамфінпляну на вытворчасьці, у саўгасах, МТС і калгасах, падыходзяць да XVII канфэрэнцыі УсеКП(б) і XIV зьезду КП(б)Б з вялікімі дасягненьнямі. Посьпехі на мэдычным фронце вялізарныя. Але пры выкарыстаньні ўсіх магчымасьцяй на гэтым фронце, мы маглі мець значна большыя перамогі.

Выходзячы з гэтага, калектыў навуковых і тэхнічных работнікаў клінічнага гарадка Беларускінстытуту ў колькасьці 500 чал. зварачаюцца да ўсіх мэдычных работнікаў БССР з закліком арганізаваць масавую падрыхтоўку да XIV зьезду нашай партыі. Ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна забясьпечыць посьпех у рабоце мэдустаноў па выкананьні праграмы чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

Мы бяром на сябе наступныя абавязкі і заклікаем усіх мэдычных работнікаў выканаць іх разам з намі ў практычнай рабоце.

— Складці сустрэчныя планы імя 4-га, заключнага году пяцігодкі на аснове шырокага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

— Перавесьці на гаспадарчы разрахунак усе клініцы і аддзяленьні, усе мэдычныя і лекавыя ўстановы.

— Правесьці масавую прапрацоўку ліста тав. Сталіна ў рэдакцыю часопісі «Пролетарская революция» і пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б) па нацыянальным пытаньні. Арганізаваць праверку ўсёй выпушчанай навукова-мэдычнай літаратуры, увязваючы гэта з разгортваньнем калектыўнай навуковай работы на базе марксыцка-ленінскай мэтадэлёгіі.

— На справе рашуча ажыцьцяўляць указаньні тав. Сталіна аб адносінах да старых спэцыялістаў, якія сумленна працуюць на карысьць сацыялістычнага будаўніцтва, праяўляючы да іх большую ўвагу, дапамагаючы ім хутчэй аўладаць марксыцка-ленінскай мэтадалёгіяй у мэдыцыне.

— Стварыць спрыяючыя ўмовы для хуткай падрыхтоўкі пралетарскіх спэцыялістаў у галіне мэдыцыны. Арганізаваць шыроку перакваліфікацыі сярэдняга і нізэйшага складу працаўнікоў мэдыцыны на 100 чал.

— Скончыць заключэньне калектыўнага дагавору, прапрацоўку сацдагавору з Ленінградскай вобласьцю на пытаньні хутчэйшай рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб ленінным мэдабслугоўваньні працоўных і на правядзеньні санітарна - аздараўленчых мерапрыемстваў на вытворчасьці і ў сацыялістычным сэктары вёскі.

— Мы бяром шэфства над заводамі «ДА», «Бальшавік» і над шматчавай фабрыкай з мэтай правядзеньня разу навукова прафілактычных мерапрыемстваў, рашучай барацьбы за зьнішчэньне захворваньняў і паляпшэньне санітарных умоў рабочых.

— Мы арганізуем шэфства і дапамогу заслаўскай райбольніцы праз брыгадныя выезды высокакваліфікаваных спэцыялістаў, праз абмен вопытам у рабоце.

— Бяром на сябе абавязак забясьпечыць стопроцантны ахоп рабочых вядучых галін прамысловасьці клінічным лячэньнем.

— Абавязваемся разгарнуць шырокую падрыхтоўку да трэцяй бальшавіцкай вясны. Стварыць брыгады для пасылкі ў калгасы і саўгасы па аказаньні мэдыцынскай дапамогі насельніцтву.

Дырэктар клінічнага гарадка ІЗРАЦЦЕЛЬ.
Сакратар ячэйкі КП(б)Б СЭГАЛЬ.
Старшыня вясковага З'ЕЗДАНКІНА.
Прафэсары: ГАЎСМАН, ВЫЛРЫН, РУБАШОЎ, ПРАКАПЧУК, САКАЛОЎСКІ.
Дацэнты: ІРГЕР, ГІНЗБУРГ.

Адкрылася Бабруйская

12 студзеня пры ўзеле 310 дэлегатаў адкрылася Бабруйская раённая партканфэрэнцыя. Сакратар райкому тав. Баўсевіч ва ўступным слове ахарактарызаваў работу партыйнай арганізацыі, паказаў на тыя перамогі, якія атрыманы ёю ў барацьбе за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Пасьля стапістрыманьня кіруючых органаў канфэрэнцыі апошняя пад гучныя воплескі выбрала ў ганаровы прэзыдыум палітбюро ЦК УсеКП(б), т. т. Андрэева, Ізьмана, Ленскага, Гея, Шаранговіча, Галадзеда і Убарэвіча.

З дакладам ЦК КП(б)Б выступіў сакратар ЦК тав. Рыскін. Даклад тав. Рыскіна заняў усё вячэрняе пасяджэньне 12 студзеня і частку раніцы пасяджэньня другога дня работ канфэрэнцыі.

Рабочую партканфэрэнцыю віталі прадстаўнікі ярэваапрацоўчага камбінату, швейнай фабрыкі, прадстаўнікі Чырвонай арміі і саўгасаў раёну.

У дзень адкрыцьця канфэрэнцыі ў горад прыбыў чырвоны абоз калгасьнікаў Паўлавіцкага сельсавету, які зрабіў 24 тоны збожжа загатоўчым арганізацыям у гонар канфэрэнцыі.

Партыйная канфэрэнцыя паслала прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б) і тав. Сталіну, газэце «Правда», ЦК КП(б)Б і т. т. Гею, Шаранговічу, Галадзеду і ЦО КП(б)Б—газэце «Зьвязда».

Адкрыўся першы ўсебеларускі зьезд працоўных немцаў

МЕНСК (Белта). 11 студзеня ў Менску адкрыўся першы ўсебеларускі зьезд працоўных немцаў. Апрача дэлегатаў на зьезьдзе прысутнічаюць госьці — пралетаўцы рэспублікі немцаў Паваложжа і з іншых месц Савецкага Саюзу.

Зьезд адкрыў сакратар ЦВК БССР тав. Гнілякевіч.

Зьезд выслухаў прывітальную прамову члена Бюро ЦК КП(б)Б тав. Гаўтмана.

З вялікім дакладам аб унутраным і міжнародным становішчы СССР выступіў старшыня ЦВК БССР тав. Чарвякоў, які паказаў малюнак вялізарнейшых дасягненьняў краіны Саветаў. У брацкім непарушным саюзе з усімі шматлікімі нацыянальнасьцямі, якія насяляюць СССР мы дабіліся вялікіх перамог на ўсіх франтох гаспадаркі. У мінулым. — кажа тав. Чарвякоў, — краіна абшарніцкіх набіткаў і роздробленых мізэрных сялянскіх гаспадарак і якую нам трэба было правесьці жорсткую барацьбу для таго, каб разграміць гэтых агентаў буржуазіі.

Нацыянал-дэмакраты ўсюды імкнуліся падкрэсьліваць, што яны змагаюцца за «беларускую культуру», за «беларускі народ». Яны настойліва працягвалі «тэорыю» аб тым, што беларуская тапуша—буйнасялянская нацыя, што гэта адзная працоўная сям'я.

Уся сутнасьць нацыянал-дэмакратаў выкрываецца ў словах аднаго са нікоднікаў, таксама нацдэма Трэмповіча. У сваіх паказаньнях ён кажа: «Першыя ўдары па кулацтве адразу закранулі Лёсіка, Смоліча і інш., пачалася нацыяналізацыя дамоў, і трывога за сваю маемасьць запанавала ўсе іншыя пітаноды. І таму зразумела, што ў гэтай групе ніякага савецкага патрыятызму быць не магло... Спачатку шопатам, а потым усё сьмялей і сьмялей пішлі разважаньні пра апошнія дні савецкай улады, бо «народ ня вытрымае гэтых мерапрыемстваў». Пашыраліся разважаньні аб інтэрвэнцыі, аб вайне. Тут ужо нацдэмам было не да беларускай культуры, не да лёсу беларускага народу. Інтарэсы ўласьнікаў былі вышэй за ўсё».

Вось вам сутнасьць беларускіх контр-рэвалюцыйных нацыянал - дэмакратаў, іх класавых інстынктаў. Калі прыпомніць шэснаццаткую «пяцігодку» культурнага будаўніцтва, установкі аб пяцігадовай школе ў процівагу сямігадовай прадпрэцкай школе, установкі каго трэба вучыць у вышэйшай школе (культурны, гаспадароў - арганізатараў — кулакоў), дык зусім відавочная робіцца, што нацдэмы трымалі лінію на патуранню крывую ў культурным будаўніцтве, што яны толькі маскаваліся барацьбой за «беларускую культуру», за «беларускі народ», а на справе выконвалі ганебную работу клясавага ворага, самі былі актыўнымі агентамі інтэрэнцыі і імпэрыялістаў, рыхтавалі адкрытае выступленьне супроць дыктатуры пралетарыяту.

(Канец у чарговым нумары).

А. Платун

Некаторыя пытаньні культурнай рэвалюцыі

Без масьніхоўнага вырашэньня праблемы культурнай рэвалюцыі нельга разьвіваць высокіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, нельга шпарэйні тэмпам будаваць сацыялістычную эканоміку, і таму задача культурна-нацыянальнага будаўніцтва ў сучасны перыяд набывае асаблівае значэньне.

У цяперашні новай абстаноўцы работы, мы абавязаны, ня зьніжаючы тэмпаў культурнага будаўніцтва, усяверна іх разьвіваючы, весьці ўпартую барацьбу за якасьць, за перабудову ўсёй нашай работы на аснове шасьці сталінскіх указаньняў, весьці барацьбу за чыстату марксыцка-ленінскай тэорыі, за ленінскую партыйнасьць нашай навукі і тэорыі.

Агульная посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва далі магчымасьць рабочай клясе Савецкага Саюзу, у прыватнасьці — Савецкай Беларусі, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, шырока разгарнуць справу культурнай рэвалюцыі.

На аснове генэральнай лініі партыі, у выпуску пяўхільнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі, рабочая кляса БССР, пад кіраўніцтвам партыі, дасягнула вялікіх перамог у нацыянальна-культурным будаўніцтве.

У 1929 годзе БССР першай з усіх нацыянальных рэспублік Савецкага Саюзу ўвяла ўсеагульнае навучаньне на базе пачатковай школы. У 1929-30 годзе нам у гэтым напрамку былі дасягнуты ўжо вялікія перамогі. Дзеці ва ўзросьце да 10-ці год былі ахоплены навучаньнем на 92 проц., а ў 1931-32 навучальным годзе — на 95 проц.

1932 год зьяўляецца годам асаблівага напружанай барацьбы за ўсеагульнае навучаньне. Па-першае, у гэтым годзе мы вынаткова закончым усеагульнае навучаньне за чатырохгодку і пачнем разгарнуць шырокую сетку пятых груп з тым, каб прыступіць да ўсеагульнага навучаньня на базе сямігодкі.

З верасьня месяца 1931 году намі ўжо ўведзены ўсеагульнае навучаньне на базе сямігодкі ў прамысловых цэнтрах, у прыбярэжных раёнах і раёнах суцэльнай калектывізацыі.

Разам з тым у мінулым годзе мы пачалі ўводзіць усеагульнае навучаньне для дарослых малапісьменных, якія скончылі лікпункты або так званыя школы граматы. Гэта работа ўводзіцца па 17 раёнах.

БССР у мінулым была адной з самых запалых у гаспадарчых і культурных адносінах акраін былой царскай Расіі. Колькасьць непісьменных перавышала 70 проц. агульнага ліку насельніцтва.

Гэта спадчына цэмры, некультурнасьці царскага ўраду намі пераможана, і мы стаім напярэдадні абвяшчэньня Савецкай Беларусі краінай суцэльнай пісьменнасьці.

Разам з тым мы павінны з усёй выразнасьцю сказаць, што нашы пасабныя прамысловыя цэнтры, з прычыны няўважлівых адносін як органаў народнай асьветы, так і грамадзкіх арганізацый, з прычыны таго, што партыйныя арганізацыі гэтых раёнаў зварачалі невыстарчальную ўвагу на кіраўніцтва справай асьветы, не выканалі важнейшай задачы, на сталі гарадамі суцэльнай пісьменнасьці. Толькі Гомель выканаў дырэктывы партыі і ўраду аб ліквідацыі непісьменнасьці па горадзе да Кастрычніцкіх сьвят 1931 году.

Да 1 мая 1932 году ўся БССР павінна стаць краінай суцэльнай пісьменнасьці. Наша задача, задача ўсіх партыйных, камсамольскіх, прафэсаюзных і асьветніцкіх арганізацый, задача вожнага настаўніка і культармейца—зрабіць усё для таго, каб гэта важнейшая дырэктыва партыі была абавязкова выканана ў тэрмін.

Апрача разгортваньня сеткі масавых школ, вялікай работы па ліквідацыі непісьменнасьці і малапісьменнасьці мы дабіліся значных посьпехаў і ў справе падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў.

На падставе пастановы ЦК УсеКП(б) правядзена вялікая рэарганізацыя прафэсіянальна-тэхнічных навучальных установаў, прафшкол, тэхнікумаў, а таксама і ВНУ. Гэта рэарганізацыя праводзілася пад знакам большай спэцыялізацыі і ўзьняцьця якасьці вучобы, пад знакам увядзеньня ленінай працоўнай і навучальнай дысцыпліны ў школах.

Мы маем за апошнія гады вялізарны рост сеткі сярэдніх і вышэйшых навучальных установаў. Калі яшчэ ў 1929 годзе ў нас было толькі 4-5 ВНУ і каля 30 тэхнікумаў, дык зараз мы маем ужо 28 ВНУ і звыш 100 розных тэхнікумаў.

Скарачэньне тэрмінаў навучаньня ў тэхнікумах і ВНУ ні ў якім разе не азначае зьнижэньне якасьці новых пралетарскіх кадраў. Мы павінны дабіцца таго, каб і ў скарочаныя тэрміны, у тыя тэрміны, якія патрабуюцца нашымі агульнымі тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва, падрыхтоўваліся высококваліфікаваныя кадры для ўсіх галін нашай народнай гаспадаркі і культурнай рэвалюцыі.

У апошні час, асабліва ў гэтым годзе, самым карэнным чынам зьмяняецца сыстэма выкладаньня ў ВНУ і тэхнікумах. У сярэдній і вышэйшай школе лекцыйны мэтад замены актыўным мэтадам работы. Скасаваны залікі, праводзіцца жорсткая барацьба з тай абязьлічкай якая была раней, асабліва ў вышэйшай школе, пры падагуленьні выпікаў прапрацаваных дысцыплін і г. д.

Значна павялічыліся асигнаваньні на культурнае будаўніцтва на бюджэце на 1932 год. Удзельная вага народнай асьветы па мясцовым бюджэце складае 46 процантаў. Амаль палова ўсяго раённага бюджэту ідзе на справу нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Па рэспубліканскім бюджэце мы займаем 25 проц., а агульная ўдзельная вага народнай асьветы ва ўсім бюджэце народнай гаспадаркі займае каля 35 проц.

Такіх дасягненьняў мы дабіліся толькі дзякуючы таму, што бальшавіцкая партыя і савецкі ўрад правільна кіравалі справай культурнага будаўніцтва, таму, што мы праводзілі і вядзем жорсткую барацьбу з клясавым ворагам, што на практыцы пяўхільна ажыцьцяўляем ленінскую нацыянальную палітыку і змагаемся з усімі ўхіламі ад лініі партыі ў нацыянальным пытаньні.

Жорсткая барацьба праведзена і вядзецца рабочай клясай БССР, пад кіраўніцтвам партыі, супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, супроць беларускага контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму і рознага мясцовага шавінізму.

Нам усім вядомы яркія факты з гэтай клясавай барацьбы. Мы ўсе памятаем вядомую гісторыю з праф. Горацкай с.-г. акадэміі Крупавым, які даваў партыі і савецкаму ўраду пароль: «Наркамзем павінен кіраваць зямельнай палітыкай, але так, каб у адной руцэ трымаць кіраўніцтва, а ў другой бізун, бо рускі мужык любіць бізун і бізуном можна лягчэй прымусіць праводзіць тыя ці іншыя мерапрыемствы».

Другі прафэсар Шчапоцьцеў, выкладчык БДУ, падаў заяву аб вызваленьні яго ад работы, матывуючы тым, што ён «не понимает иностранного языка».

Прафэсар Армфэльд, які працаваў у Горацкай с.-г. акадэміі, а пазьней—у Гомельскім лясным інстытуце і політэхнічным інстытуце, каб была выкрыта шкодніцкая контр-рэвалюцыйная рамізнаўская арганізацыя і калі ўся асноўная маса навуковых работнікаў, усе працоўныя рэзка асуджалі гэтых агентаў імпэрыялістаў і інтэрвэнтаў, заяўлялі: «Я ня ведаю, хто праў і хто вінават. Можа ДПУ, а можа і Рамзін, таму я ніякіх пратестаў падпісваць ня буду».

Гэтыя-ж самы прафэсар Армфэльд на пытаньне—чаму ён ня член прафсаюзу—адказаў: «Прафсаюз—гэта школа камунізму, а я камуністам быць не хачу, дык няма чаго быць і членам прафсаюзу».

Апрача таго мы мелі палы рад актывізаваных выступленьняў, як вялікарасійскіх шавіністаў, так і мясцовых шавіністаў розных масьцей.

Мы маем ухіл у бок вялікарасійскага шавінізму ў працах пасабовых навуковых работнікаў, у прыватнасьці, і ў зборніку «Навука на службе нацыянал-дэмакратаў» пад рэдакцыяй тав. Вальфсона.

Мы правялі жорсткую барацьбу з беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам. Нацыянал-дэмакраты асабліва напыралі свой уплыў у культурным будаўніцтве. Школа, розныя іншыя зьвяньні культурнай рэвалюцыі зьяўляюцца тымі ўстановамі, якія выхоўваюць маладое пакаленьне на актыўную, сьвядомую барацьбу за канчатковае ўстаўленьне камунізму. І праз гэтыя зьвяньні, праз гэтыя шляхі нацыянал-дэмакраты працягвалі сваю контр-рэвалюцыйную атруту, імкнуліся прышчапіць нашай моладзі клясава - варожую ідэалёгію, падрыхтаваць яе для барацьбы супроць савецкай улады.

Нацдэмаўскім кіраўніцтвам Наркамасьветы ў 1929 годзе была складзена «пяцігодка» культурнага будаўніцтва. Гэта «пяцігодка» зьяўляецца яркім дакумэнтам шкодніцкай работы нацдэмаў, яна была накіравана на стварэньне труднасьцяй у выкананьні культурнай рэвалюцыі, на крыў усяго сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР.

Напрыклад, на гэтай «пяцігодцы» да 1932-33 году намячалася ахапіць дашкольным выхаваньнем толькі 6 проц. дзяцей, а мы ўжо зараз ахапілі 15 проц.

Нацдэмаўская «пяцігодка» прадугледжвала ўвядзеньне ўсеагульнага навучаньня толькі ў 1934-35 годзе. Нацдэмы намячалі да канца сваёй «пяцігодкі» ахапіць рабфакамі 3 з палавой тысячы чалавек, а ўжо зараз, у пачатку чацьвертага году пяцігодкі, у іншых рабфаках навучаецца 13.000 чалавек. Тое-ж самае мы маем і па вышэйшай асьвеце, калі ўжо ў гэтым годзе перавыконваем намячаныя нацдэмаўскай шкодніцкай «пяцігодкі» ў 3-4 разы.

У 1928 г., калі на сэсіі ЦВК абгаварваліся пытаньні народнай асьветы выступаў Гарацкі, былі дырэктар ПДІ, шкодзік-кандрацьцевец з такой прамовай: «Ня варта лавіць жорава ў небо, трэба даць мужыку сяніну ў рукі. Ня будзем будаваць цэпер сямігадовыя школы, хапайце лепш пабудуем больш пяцігадовых школ».

Такія «установкі» прывялі да таго, што мы і зараз яшчэ маем буйнейшы разрыў паміж тэхнікумамі і сямігодкамі. Напрыклад, на 1931-32 год у нас не хапае каля 18 тысяч патрэбных вучняў для тэхнікумаў і ФЗВ.

Нацдэмы, праводзячы кулацкую палітыку ў гаспадарчым будаўніцтве, цалкам падкарпкавалі ёй і задачы школьнай асьветы. Яны хацелі даць селяніну агранамічную асьвету, таму «селяніну-дасьледчыку», які мае сваю культурную гаспадарку і які ўсмерна не ўмацняе. Інакш кажучы, браліся стаўка на ахоп агранамічнай асьветай заможнай, кулацкай верхаўны вёскі.

Падручнікі і праграмы таго часу ў значнай сваёй ступені былі насычаны адкрытымі нацдэмаўскімі імкненьнямі і клясава-варожым зьместам. Некрашэвіч Сьцяпан у сваіх лекцыях, Язэп Лёсік—у граматыках, праваніках і сынтаксах. Грамына—у геаграфіі працягвалі адкрытую контр-рэвалюцыю.

З гэтых прыкладаў відаць якую шкодніцкую работу праводзілі нацдэмы і якую нам трэба было правесьці жорсткую барацьбу для таго, каб разграміць гэтых агентаў буржуазіі.

Нацыянал-дэмакраты ўсюды імкнуліся падкрэсьліваць, што яны змагаюцца за «беларускую культуру», за «беларускі народ». Яны настойліва працягвалі «тэорыю» аб тым, што беларуская тапуша—буйнасялянская нацыя, што гэта адзная працоўная сям'я.

Уся сутнасьць нацыянал-дэмакратаў выкрываецца ў словах аднаго са нікоднікаў, таксама нацдэма Трэмповіча. У сваіх паказаньнях ён кажа: «Першыя ўдары па кулацтве адразу закранулі Лёсіка, Смоліча і інш., пачалася нацыяналізацыя дамоў, і трывога за сваю маемасьць запанавала ўсе іншыя пітаноды. І таму зразумела, што ў гэтай групе ніякага савецкага патрыятызму быць не магло... Спачатку шопатам, а потым усё сьмялей і сьмялей пішлі разважаньні пра апошнія дні савецкай улады, бо «народ ня вытрымае гэтых мерапрыемстваў». Пашыраліся разважаньні аб інтэрвэнцыі, аб вайне. Тут ужо нацдэмам было не да беларускай культуры, не да лёсу беларускага народу. Інтарэсы ўласьнікаў былі вышэй за ўсё».

Вось вам сутнасьць беларускіх контр-рэвалюцыйных нацыянал - дэмакратаў, іх класавых інстынктаў. Калі прыпомніць шэснаццаткую «пяцігодку» культурнага будаўніцтва, установкі аб пяцігадовай школе ў процівагу сямігадовай прадпрэцкай

ПАЧАУСЯ ЎСЕБЕЛАРУСКІ ФІНАНСАВЫ ПАХОД

Сіроціна высунула сустрэчны—да XIV зьезду КП(б)Б выканаць студзеньскі фінплян

Да 15-га сакавіка выканаць заданьне 1-га кварталу

Для забесьпячэньня поўнага выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў першага кварталу 1932 года да 15 сакавіка, Савет Народных Камісараў БССР пастанавіў правесьці з 10 студзеня г. г. усебеларускі фінансавы паход.

Для кіраўніцтва паходам арганізаваны рэспубліканскі штаб пад старшынствам тав. Ляхава з прадстаўнікоў ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, цэнтральнай камісіі саўдзельнасьці ляржкредыту і апчадсправе, ПСПСБ, ЦП саюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў, НКФ, Белкаапсаюзу, Белкалгаспэнтру, кіраўніцтва апчадкасамі, Дзяржбанку, заводу імя Варашылава і рэдакцый цэнтральных газэт.

На месцах арганізаваны раённыя штабы з прадстаўнікоў раённых устаноў і арганізацый і сельскія—у складзе прадстаўнікоў сельсаветаў, партыйных і камсамольскіх ячэек, спажывецкіх таварыстваў, буйнейшых калгасаў, ударнікаў фінансавага фронту, вагончыкаў хат-чытальняў і г. д.

Для прэміяваньня лепшых гарадоў, раёнаў, арганізацый, сельскіх саветаў, прадпрыемстваў, калгасаў і паасобных ударнікаў фінансавага фронту, у распараджэньне рэспубліканскага штабу вылучаецца 100 тыс. руб.

Гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам прапанавана для гэтай-жа мэты вылучыць у распараджэньне раённых штабаў спэцыяльныя прэмізльныя фонды.

Савет Народных Камісараў абавязаў усе цэнтральныя ўстановы, гарадзкія саветы і раённыя выканаўчыя камітэты, пры актыўным удзеле прафсыянальных і камсамольскіх арганізацый забясьпечыць шырокае разгортваньне арганізацыйна-масавай работы вакол фінансавага паходу.

Сіроцінскія ўдарнікі выступілі ў паход

СІРОЦІНА. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). ДРУГІ РАЁННЫ ЗЬЛЭТ УДАРНІКАЎ ФІНАНСАВАГА ФРОНТУ, СІРОЦІНСКАГА РАЁНУ, АБВЯСЦІЎ СЯБЕ МАБІЛІЗАВАНЫМ НА АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЕ СУСТРЭЧНАГА ПЛЯНУ ДА 14 ЗЬЕЗДУ КП(б)Б, 18 СТУДЗЕНЯ, ВЫКАНАЦЬ ФІНПЛЯН ЗА СТУДЗЕНЬ, ДА ЎСЕСАЮЗНАЙ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ — 80 ПРОЦ. КВАРТАЛЬНАГА ЗАДАНЬНЯ, ДА 15 САКАВІКА—УСЕ 100 ПРОЦ. КВАРТАЛЬНАГА ПЛЯНУ.

Тэлеграма т. Хацкевіча

Наркамфін БССР тав. Хацкевіч даслаў наступную тэлеграму ўсім раённым фінадзелам: фінансавая сыстэма абавязваецца выкачаць месячнае заданьне па мабілізацыі сродкаў да XIV зьезду КП(б)Б і палову квартальнага заданьня да XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі. Разгарнеце па-бальшавіцку масавую работу вакол фінансавага паходу. Рапартуйце аб выніках работы XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі.

Друкарня імя Сталіна дабілася бліскучага посьпеху

ЗА ДРУКАРНЯЯ ІМЯ СТАЛІНА У СЬНЕЖНІ ЛІЧЫЛАСЯ ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦЬ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ НА СУМУ 24.000 РУБ., ПРЫЧЫМ, КАЛЯ 56 ПРОЦ. ГЭТАЙ СУМЫ ПЕРЫПАДАЛА НА ПАЗЫКУ «ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ». ДЛЯ ЛІКВІДАЦЫІ ГЭТАЙ ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦІ БЮРО ПАРТЫЙНАГА КАЛЕКТЫВУ ДРУКАРНІ АБВЯСЬЦІЛА ПЯЦІДЗЕНЬНІК ШТУРМУ. У ЧАСЕ ЯКОГА БЫЛА ПРАВЕДЗЕНА ВЯЛІКАЯ МАСАВА-РАСТЛУМАЧАЛЬНАЯ РАБОТА ПА ЦЭХАХ. ПЯЦІДЗЕНЬНІК ДАЎ ВЯЛІКІЯ ПОСЬПЕХІ Ў МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ.

ЗА ЧАС ШТУРМУ ПАДПІСКА ПА ПАЗЫКУ ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ НА СУМУ 11.960 РУБ., УКЛАДЫ Ў АШЧАДКАСУ — НА 4.050 РУБ.; ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАНА КВАРТАЛЬНАЕ ЗАДАНЬНЕ ПА ПАЯНАКАПЛЕНЬНІ; 90 ПРОЦ. РАБОЧЫХ АХОПЛЕНА СТРАХАВАНЬНЕМ. ПЕРШЫМІ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ ІДУЦЬ МАШЫНЫ І ПЕРАПЛЕТНЫ ЦЭХІ, ЯКІЯ НЯ ТОЛЬКІ ЦАЛКАМ ЛІКВІДАВАЛІ ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦЬ, АЛЕ НАВАТ НА 100 ПРОЦ. ПЕР ВЫКАНАЛІ ЗАДАНЬНЕ. ГЭТЫЯ ЦЭХІ ПРЭМІЯВАНЫ ЗА ЎДАРНУЮ РАБОТУ.

Я.

Вынік ударнай работы

МАГІЛЕЎ.

Лёзунг аб датэрміновым выкананьні фінпляну 1931 г. быў шырока падхоплен перадавымі прадпрыемствамі Магілеву (шаўковай фабрыкай, цукеркай, друкарняй). Паасобныя адсталыя прадпрыемствы, як напрыклад швейная фабрыка, завод «Адраджэньне» былі ўзяты на буксір. У падшэфныя сельсаветы для дапамогі пасылаліся брыгады. У выніку праведзенай работы, заданьне чацьвертага кварталу выканана па 108,1 проц. У першых радох ідуць апчадкасы, якая дала за квартал 176 проц. выкананьня пляну, і гарсавет, які перавыканаў пляны па абавязковых плацяжох.—па падаходным падатку—на 44 проц., прамысловым — на 57 проц., культзборы—па 84 проц.

Але, побач з прадпрыемствамі і ўстановамі, якія разгарнулі бальшавіцкую барацьбу за фінплян, нельга абмінуць і такіх, як райспажыўсаюз, лесрабкоп і торфрабкоп, якія ня здолелі мабілізаваць на гэтым пытаньні масы пайшчыкаў, не стварылі фінансавага актыву. Факты выкананьня фінпляну райспажыўсаюзам—па 52,3 проц., лесрабкопам—па 58,5 проц., торфрабкопам—па 33,6 проц. выразна гавораць аб «рэбоце» гэтых устаноў.

МТС, райпа і райкалгасаюз таксама ня справіліся са сваімі задачамі і выканалі толькі 34,8 проц. пляну рэалізацыі акцый трактарацэнтру.

М.

У першай калёне байцоў за фінплян

Віцебская ШВЭЙНАЯ ФАБРЫКА «ПРАФІНТЭРН», дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыйнай арганізацыі, дабілася вялікіх посьпехаў на фінансавым фронце. На сёньнішні дзень план 1931 г. па ўкладах у ашчадкасы выконан на 200 проц. Усе рабочыя ахоплены налетыўным страхаваньнем. Зараз фабрыка ўзяла на буксір 14 адстаючых прадпрыемстваў. За прыкладную работу па выкананьні фін пляну Наркамфін Беларусі прэміраваў лепшых ударнікаў фінансавага фронту.

За перавыкананьне заданьня гарсавет перадаў фабрыцы пераходны чырвоны сьцяг. Гэта яшчэ больш узьняло актыўнасьць рабочых. Камісія саўдзельнасьці фабрыкі разгарнула дадатковую падпіску на пазыку «Трэці рашаючы», абвясьціўшы конкурс на лепшага расп'ясьніцеля. Па ўсіх цэхах праводзілася шырокая растлумачальная работа. На першым месцы ідзе ЦЭХ ПАЛІТО, які даў 6.200 руб. У выніку праведзенай работы фабрыка дабілася дадатковай падпіскі на суму 13.000 руб.

Сялянская дапамога аказана фабрыцы імя Клары Цэткін, дзе буксірная брыгада «Прафінтэрн», сабрала 1.000 руб. дадатковай падпіскі.

Для дапамогі выкананьню заданьня па пазыцы на ст. Віцебск МББ чыг. рэдакалегія шматтыражкі «Прафінтэрнавец» вылучыла рабкораўскую брыгаду, якая за акцін дзень рэалізавала аблігацый на 938 руб.

М. УЗЬДЗІН.

ПЕРАДАВЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ БССР, ГАСПАДАРЧА-РАЗРАХУНКОВЫЯ БРЫГАДЫ—РЫХТУЮЦЬ ДА ЗЬЕЗДУ РАПАРТЫ АБ ПЕРАВЫКАНАНЬНІ ПРАГРАМ

Сустрэчны плян „Бальшавіка"

4-га сьнежня мінулага году ГАРБАРНЯ «БАЛЬШАВІК» датэрміново выканала прамфінплян трэцяга рашаючага году, дабіўшыся выпуску прадукцыі на 112,13 проц. заданьня. Гэта перамога дасягнута ў выніку ўздыму сацспаборніцтва і ўдарніцтва, вытворчага энтузіязму рабочых і ІТР заводу, якія пад кіраўніцтвам партарганізацыі на працягу году рашуча змагаліся за бальшавіцкія тэмпы.

Усьвядомліўшы ўсё значэньне задач апошняга году пяцігодкі, рабочы калектыў чырвонасьцяжнага «Бальшавіка» разгарнуў вялікую прапрацоўку сустрэчнага прамфінпляну і рацыяналізацыі.

Быў выпушчан бюлетэнь, арганізован выпуск брыгадных штодзённак, цалкам прысьвечаных сустрэчнаму. Пастаўлены адпаведныя даклады на вытворчых нарадах, праведзена некалькі гутарак у цэхах.

Разгарнуліся выклікі брыгад на сацспаборніцтва па сустрэчным пляне. Брыгада набіўшчыкаў абавязалася павялічыць прадукцыйнасьць працы на 6 проц. ІТР жэлязнага цэху абвясьцілі сябе ўдарнікамі па хутчэйшым ажыцьцяўленьні рабочых прапаноў і актыўным удзеле ў падрыхтоўцы сустрэчнага пляну. Брыгада намазчыкаў высунула сустрэчны плян — на 260 апочных адзінак больш, чым прадугледжана вытворчым заданьнем. Шпальтоўшчыкі павысілі нормы па вырастку з 450 штук да 475, па сьвіных скурах — з 620 да 650. Брыгада зольшчыкаў жэлязнага цэху ўзяла на сябе абавязацельства — моздру са складу забіраць адразу, каб яна не залежвалася і не псавалася. Сталяры зьнізілі расцэнкі на 5 проц.

Хваля сустрэчных плянаў пракацілася па ўсіх цэхах. Першы хромавы цэх паводле сустрэчнага пляну павялічвае прадукцыйнасьць працы на 8,37 проц., другі хромавы—на 6,82 проц., жэлязнымавы—на 2,77 проц. У сустрэчны плян рацыяналізацыі ўнесена 49 рабочых прапаноў.

Ударнікі заводу рыхтуюць да XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі рапарт аб выкананьні сустрэчнага прамфінпляну.

Калектыў заводу абавязаўся ва што-б там ні стала ажыцьцявіць тыя заданьні, якія стаяць перад імі ў чацьвертым, заключным годзе.

Брыгада: З. МІНКІН, І. ШАМЭС.

Брыгада т. Красоўскага перавыконвае заданьні

АДНОЙ З ЛЕПШЫХ ГАСПАДАРЧА-РАЗРАХУНКОВЫХ БРЫГАД ЗАВОДУ ІМЯ ДОМБАЛЯ (БАРЫСАЎ) ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА БРЫГАДА ТАВ. КРАСОЎСКАГА, ВЫТВОРЧУЮ ПРАГРАМУ ЗА СЬНЕЖАНЬ ЯНА ВЫКАНАЛА НА 104 ПРОЦ. БОЙ ШКЛЯНОЙ ПРАДУКЦЫІ ЗАМЕСТ 2 ПРОЦ., ВЫСУНУТЫХ СУСТРЭЧНЫМ ПЛЯНАМ. ЗЬНІЖАН ДА 1,5 ПРОЦ. БРАК ЗЬМЕНШАН ДА 0,9 ПРОЦ. СУПРОЦЬ ЗАДАНЬНЯ Ў 1.25 ПРОЦ. БРЫГАДА ДАЛА ЭКАНОМІІ ЗА МЕСЯЦ У РАСХОДАВАНЬНІ ДЭФІЦЫТНЫХ МАТАР'ЯЛАЎ У 52 РУБ.

БРЫГАДА ПАСТАВІЛА СВАЁ ЗАДАЧАЙ — ДА XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б ДАБІЦЦА НАЙЛЕПШЫХ ВЫНІКАЎ У ВЫКАНАНЬНІ КОЛЬКАСНЫХ І ЯКАСНЫХ ПАКАЗАЛЬНІКАЎ.

Б. Т.

222 тысячы скрынак замест 192.000

БАРЫСАЎ. (БЕЛТА). Фабрыка запалак «Пралетарская перакога» дабілася значных посьпехаў у выкананьні вытворчых заданьняў. Брыгады аўтаматнага цаху за апошнія языя пяцідзёнкі выканалі прамфінплян на 100 проц. і з'эканомілі 71 кілё парафіну і масла. Гаспадарча-разрахунковыя брыгады першай і трэцяй зьмены зьмальнага цаху перевыканалі прамфінплян: замест заданьня ў 192.000 скрынак запалак, яны штодзённа робяць 222.000. Значна зьменшыліся выпадкі паломак машын.

Справа гонару друку

Агляд друку

„Зьвязда" - орган ЦК КП(б)Б, „Рабочий"—усебеларуская рабочая газ., „Рабселькор"—газ. рабселькораў БССР

Узор бальшавіцкага правядзеньня ўсесаюзнага конкурсу нізавых газэт, абвешчанага «Правдой», паказаў друк Беларусі. Цэнтральны раённы і нізавы друк, баявыя брыгады друку Беларусі шырокім фронтам выступілі на барацьбу за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Друк Беларусі першым у СССР падхапіў заклік «Правды» аб уключэньні ва ўсесаюзны конкурс нізавых газэт.

«Справа конкурсу — справа ўсіх партарганізацый, усёй пралетарскай грамадзкасьці».

Такім лёзунгам пачала конкурс 1-га лістапада «Зьвязда» — орган ЦК КП(б)Б. Уключыўшыся ў конкурс праз два дні пасьля апублікаваньня ў «Правде» матар'ялу на конкурсе, «Зьвязда» падала добры прыклад усяму друку Беларусі.

У № 298 «Зьвязды» ад 1-га лістапада паведамляецца аб радзе практычных мерапрыемстваў па конкурсе: 12 работнікаў цэнтральных газэт Беларусі мабілізаваны на месяц для ўмацаваньня работы раённых газэт па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў, узмацненьні барацьбы за выкананьне пляну загатовак. 5 раённых газэт на час конкурсу праведзены на штодзённы выхад. 7 раённых газэт прыступілі да выпуску штодзённых апэратыўных бюлетэняў. Выдана 50.000 спэцыяльных макетаў штодзённак для калгасаў і саўгасаў.

У далейшым «Зьвязда» на сваіх старонках паказвае прыклады добрай і дрэнная работы па конкурсе ў раёнах Беларусі. Напрыклад, у № 313 паведамляецца:

«11 лістапада сіламі рабселькораў (Слуцкі раён) арганізован ударны рабселькораўскі чырвоны абоз са збожжам і бульбай».

«У Талачынскім раёне райкомам партыі мабілізавана 15 раённых работнікаў з партыйнага актыву для ўзмацненьня работы па разгортваньні конкурсу. З моманту уключэньня раёну ў конкурс на 25 лістапада партячэйкамі, сумесна з прымацаванымі работнікамі праведзена 6 куставых спэцыялізаваных зьлётаў рабселькораў калгасаў і саўгасаў. На зьлётах былі арганізаваны ударныя брыгады для ліквідацыі прарыву у апрацоўцы ільну, абмалоце збожжавых і арганізацыі чырвоных абозаў».

У № 321 адзначаецца ініцыятыва барысаўскай раённай газэты «Бальшавік Барысаўшчыны», якая правяла збожжавую эстафету па лепшае выкананьне пляну загатовак.

Падобных прыкладаў нямала. Большасьць партыйных арганізацый і раённых газэт Беларусі на-баявому разгарнула апэратыўна - масавую работу ў сувязі з конкурсам. Вялізарнае палітычнае значэньне мае арганізаванае выступленьне ў друку сакратароў 20 райкомаў КП(б)Б па пытаньнях конкурсу. У калектыўным лісьце сакратары 20 райкомаў па-бальшавіцку прызнаюць, што

«тая работа, якая намі ў сувязі з конкурсам прароблена, бязумоўна, невыстарчальная. Каб забясьпечыць штодзённае партыйнае кіраўніцтва ўсёй работай, якая разгарнулася вакол конкурсу, намячаем наступныя канкрэтныя мерапрыемствы: склікаць спэцыяльную агульнараённую нараду сакратароў партыйных ячэек і сельпарткомаў, на якой абмеркаваць мерапрыемствы па разгортваньні конкурсу і пытаньне аб стварэньні як на беларускай мове, так і на мовах нацыянальных меншасьцей штодзённых насьценгазэт ва ўсіх найбольш буйных калгасах і саўгасах. Пытаньне аб арганізацыі і правядзеньні конкурсу абмеркаваць на адкрытых сходах усіх партячэек...».

***

Вялікі і рознастайны матар'ял па пытаньнях конкурсу дае «Рабочий»—усебеларуская штодзённая рабочая газэта. «Рабочий» паказаў добры ўзор мабілізацыі фабрычна - заводзкага друку і рабкораў на дапамогу арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў. «Рабочий» арганізуе шэфства заводзкіх шматтыражак над калгаснымі ярукам. Пры рэдакцыі адбылася спэцыяльная нарада, на якой работнікі заводзкага друку заводаў «Камунар», «Бальшавік», «Дрэваапрацоўшчык», абутковай фабрыкі і інш. пастанавілі паслаць вызныя брыгады ў падшэфныя калгасы, саўгасы і МТС.

У радзе нумароў «Рабочий» паказвае, як на справе асобныя атрады рабкораў дапамагаюць пасьцепным газэтам саўгасаў і калгасаў. 21 лістапада ў № 273 «Рабочего» апублікавана спэцыяльная пастанова ПСПСБ, у якой ухваляецца пачын менскіх заводзкіх шматтыражак і прапануецца «прафсаюзным арганізацыям выкарыстаць у практычнай рабоце гэты пачын». «Рабочий» зьвярнуўся в заклікам да ўсіх гарадзкіх газэт Беларусі ўключыцца ў актыўную барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, саўгасаў і МТС. Гэты заклік знайшоў водгук. У перадавым артыкуле «Рабочего» пад загалоўкам «Большевистский поход на помощь организационно-хозяйственному укреплению колхозов» (№ 273) адзначаецца значнае ажыўленьне шэфскай работы.

На старонках «Рабочего» паказай вопыт рабкораў заводу імя Варашылава, якія ў падшэфным Грычанскім сельсавеце наладзілі выпуск штодзённай газэты; рабкораў швэйнай фабрыкі «Кастрычнік», якія на чале з сакратаром парткалектыву выехалі ў падшэфны раён і правялі там вялікую работу; рабкораў абутковай фабрыкі, якія ў падшэфным сельсавеце арганізавалі 5 ударных брыгад і дапамагалі наладзіць выпуск насьценгазэт і г. д. Завод за заводам, горад за горадам уключаліся ў конкурс, абвешчаны «Правдой». Рад заводзкіх партарганізацый умела выкарысталі конкурс для ажыўленьня ўсёй шэфскай работы, для ўзмацненьня пралетарскага ўплыву і канкрэтнай дапамогі ў рабоце па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. З нумару ў нумар «Рабочий» друкуе лісты вызных рабкораўскіх брыгад, рапарты, сандагавары і г. д.

Па ініцыятыве «Рабочего» ў Менску быў склікан сход рэдкалегій нізавых кашэцкіх насьценгазэт і сакратароў каапэрацыйных парт'ячэек. Гэты сход паклаў пачатак масаваму руху насьценгазэт каапэраты, у асаблівасьці насьценгазэт сельскагаспадарчых таварыстваў на дапамогу арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў.

Вялікую работу «Рабочий» правёў па ўключэньні ў конкурс нізавых газэт гарсаветаў і дэпутацкіх груп. 16 сьнежня «Рабочий» дае вялікую падборку пад загалоўкам «Включить горсоветы в конкурс, об'явленный «Правдой», расширить условия социалистического соревнования между УССР, БССР и Северным Кавказом». Менскі гарсавет уключыўся ў конкурс «Правды» і выклікаў на спаборніцтва гарадзкія саветы Гомелю, Віцебску, Бабруйску, Рэчыцы, Полацку, Добрушу, Оршы, Магілеву і Жлобіну. У наступным нумары «Рабочего» дана падборка пад агульным загалоўкам: «Депутатские группы предприятий — на борьбу за укрепление колхозов», дзе ідзе абмеркаваньне пытаньне аб пэрсанальнай адказнасьці за дапамогу саўгасна-калгаснаму друку з боку членаў гарсавету, якія выжыдаюць у раёны.

На наступны дзень дэпутаты гарсавету — шэйнікі абвясьцілі сябе мабілізаванымі для ўдзелу ў конкурсе.

Наколькі выключна важнае палітычнае значэньне ўсесаюзнага конкурсу нізавых газэт надана ў Беларусі, можна меркаваць па тым, што ПК КП(б)Б у сьнежні прыняў спэцыяльную пастанову па гэтым пытаньні. ЦК КП(б)Б указаў:

«Усю работу па правядзеньні конкурсу праводзіць пад лёзунгам «Справа арганізацыі правядзеньня конкурсу «Правды» — справа усёй КП(б)Б, усёй пралетарскай грамадзкасьці БССР. Работу па конкурсе спалучыць з арганізацыяй масавай праверкі таго, як на месцах ажыцьцяўляецца пастанова ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб нізавым друку і рабселькораўскім руху. На гарадзкіх і раённых партыйных канфэрэнцыях заслухаць спэцыяльныя паведамленьні аб значэньні і ходзе конкурсу».

ЦК КП(б)Б прапанавае:

«вылучыць 25 саўгасаў, калгасаў і МТС, у якія камандыруюцца на месяц работнікаў цэнтральных (уключаючы радыёгазэты) і частка гарадзкіх газэт для нападзіньня работы ў мясцовай насьценнай газэце, асабліва па частцы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Стварыць усебеларускі прэміяльны фонд».

***

Вялізарную арганізуючую ролю ў разгортваньні конкурсу на раёнах Беларусі адыгрывае «Рабселькор» — газэта рабселькораў Беларусі. «Рабселькор» уключыўся ў конкурс на другі тэзіс пасьля абвяшчэньня конкурсу ў «Правде» і правёў выключную арганізацыйнасьць у асьвятленьні ходу конкурсу па Беларусі. Асноўныя работнікі рэдакцыі «Рабселькора» пасланы непасрэдна ў калгасы і саўгасы і там на месцы дабіваюцца павышэньня ролі селькораў у барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Старонкі «Рабселькора» запоўнены рознастайным матар'ялам аб конкурсе, зводкамі, інструкцыйнымі артыкуламі, апісаньнямі добрых і дрэнных узораў арганізацыйна-масавай работы па конкурсе. У дапамогу нізавому сельскаму друку «Рабселькор» выдаў 11.000 экземпляраў - спэцыяльнага дадатку: умоў конкурсу і іншых інструкцыйных матар'ялаў.

***

Большасьць раённых газэт, раўняючыся па цэнтральным друку Беларусі, таксама па-баявому правяло конкурс. Адтак, сярод раённых газэт БССР ёсьць і адстаючыя. Цэнтральная конкурсная камісія пры «Зьвязде» сыстэматычна заслухоўвае даклады апошніх і дапамагае ім стаць у першыя разы конкурсу. Напрыклад, конкурсная камісія заслухала даклады «Палескай праўды» Гомельскага раёну, якая з вялікім спазьненьнем уключылася ў конкурс, газэты «Бальшавік Барысаўшчыны» і інш. Зараз гэтыя газэты некалькі выправіліся.

Першыя вынікі правяденьня конкурсу ў Беларусі сьведчаць аб вялікіх зрухах у правядзеньні загатовак збожжа і ільну, у мабілізацыі мас калгасьнікаў на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Ва ўсіх раёнах Беларусі, дзе разгарнуўся конкурс, адзначаецца бурны рост нізавога друку, нарасце насьценгазэт на штодзённы і трохдзённы выпуск. Паводле пяцідзённых вестак, за час конкурсу ўзьнікла больш 600 новых насьценгазэт. Па ініцыятыве сельскораў арганізаваны сотні чырвоных абозаў са збожжам і ільном. Рост рабселькораўскага руху, павышэньне ролі нізавога друку — адна з самых яркіх адзнак бурнага росту культурнага ўзроўню і палітычнай актыўнасьці шырокіх мас розных нацыянальнасьцей, якія аб'яднаны Беларускай Савецкай Рэспублікай. Разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва паміж Беларусьсю, Украінай і Паўночным Каўказам насуперніца зьяўляецца новай перамогай у галіне ўмацаваньня і пашырэньня культурнай і палітычнай сувязі розных нацыянальнасьцей Савецкага Саюзу.

Гэта спаборніцтва рэспублік павінна павысіць актыўную ролю бальшавіцкага друку ўсіх рэспублік і нацыянальных абласьцей СССР у барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

«ПРАВДА»

В САМАХВАЛАЎ

На грані другой пяцігодкі

Папярэднія вынікі першых 3-х год

Прамысловасьць у даваеннай Беларусі—напыянальна-прыгнечанай акраіне былой расійскай імпэрыі—характарызавалася надзвычай слабым разьвіцьцём і нізкім тэхнічна-энэргетычным узроўнем. Уся валавая прадукцыя прамысловасьці Беларусі ў 1915 годзе складала 59 млн. рублёў пры колькасьці занятых у ёй рабочых у 17.676 чал. Па сваім характары гэта была прамысловасьць паўсаматужнага тыпу, якая за рэдкімі выключэньнямі грунтавалася на перапрацоўцы мясцовага сельска-гаспадарчага і лясного сыроду. Мінэральны сыроп, апрача гліны для керамічнай вытворчасьці, ніводзе не скарыстоўваўся.

Пэрыяд імпэрыялістычнай вайны і бальшэвіцкай акупацыі асабліва цяжка адбіўся на становішчы і без таго вузкачнай прамысловасьці БССР.

З 715 прадпрыемстваў, якія мяліся ў 1914 г., 480 было зусім ліквідавана, а становішча рэшты патрабавала вельмі значных адбудоўчых работ. У выніку ў першыя гады пасьля грамадзянскай вайны аб'ём выпуску прадукцыі прамысловасьці быў у значнай ступені ніжэйшы дазаеннага. Валавая прадукцыя не складала ў 1922-23 г. па рэспубліканскай і саюзнай прамысловасьці ўсяго 22,2 млн. руб., пры 9.765 рабочых.

Тарфяная прамысловасьць, напрыклад, была прадстаўлена толькі 2 торфараспрацоўкамі. Сезонная выпрацоўка 1921 г. складала 2.800 куб. саж. торфу.

Уся мэталяапрацоўчая прамысловасьць па г. Менску была прадстаўлена ў 1920 г. адным невялікім заводам з 25 рабочымі.

Становішча гарбарна-абутковай прамысловасьці ў гэты час досыць яркі характарызуецца тым, што «Белкож», маючы 6 вытворчых аддзелаў, налічваў усяго 283 рабочых і служачых.

Усё гэта з надзвычайнай яркасьцю паказвае, перад якімі труднасьцямі ў разьвіцьці народнай гаспадаркі апынулася рабочая клясна БССР.

Безадкладна пасьля грамадзянскай вайны партыя прыступіла да адбудовы ня зруйнаванай прамысловасьці БССР.

Пэрыяд ад 1921 г. да 1927-28 г. характарызуецца значнымі посьпехамі ў галіне ўздыму індустрыяльнага ўзроўню краіны, у галіне аднаўленьня прамысловасьці і разам з гэтым разьвіцьця раду галін на базе новага будаўніцтва.

Калі валавая прадукцыя ў 1922-23 годзе складала 22,2 млн. руб., то ў 1927-28 г. узровень яе дасягнуў звыш 109 млн. руб., павялічыўшыся, такім чынам, больш чым у 4, 5 разы. Калі колькасьць рабочых у 1922-23 г. у прамысловасьці складала 9.795 чал., то ў 1927-28 г. лік рабочых складаў больш 27,5 тыс. чал. (па ўсёй прамысловасьці ВСНГ *).

За пэрыяд з 1923 па 1928 год прамысловасьць перавысіла даваенны ўзровень, значна ўзмацніла паасобныя галіны, папоўніла іх новымі прадпрыемствамі, значна рэканструявала старыя, у выніку чаго павысіўся іх тэхнічна-эканамічны ўзровень.

Зусім новай галінай прамысловасьці зьявілася распрацоўка торфу ў БССР. Зьяўляючыся багацейшай энэргетычнай і сыравой базай, торф ва ўзрастаючай скарыстоўваўся ў зусім незначных разьмерах, ня гледзячы на тое, што запасы яго на плошчы 640 тыс. гэкт., складаюць 1.200 млн. тон паветрана-сухога торфу.

Узрасьлі асноўныя фонды прамысловасьці, складаючы ў 1927-28 годзе 54,3 млн. руб.

XV зьезд УсеКП(б) ярка намеціў шлях, па якім павінна было быць пакіравана разьвіцьцё народнай гаспадаркі адсталых нацыянальных раёнаў, да якіх адносілася і БССР.

«Пяцігадовы плян павінен аддаваць асаблівую ўвагу пытаньням узьніку эканомікі і культуры адсталых нацыянальных акраін і адсталых раёнаў, выходзячы з неабходнасьці паступовай ліквідацыі іх эканамічнай і культурнай адсталасьці, адпаведна прадугледжваючы больш шыркі тэмп разьвіцьця іх эканомікі і культуры, выходзячы з увагі патрэб гэтых раёнаў з патрэбамі Саюзу».

У даным артыкуле мы не закранаем пытаньня аб тым якую барацьбу правяла партыя са шкодніцтвам у пляніраваньні.

Пройдзены в 1927-28 г. шлях адкрыў эпоху грандыёзных заваяваньняў рабочай клясы БССР на фронце індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі.

ВАЛАВАЯ ПРАДУКЦЫЯ. Рост валавой прадукцыі ў цэлым далёка апярэдзіў за сабой намячэньні пяцігадовага пляну. Правільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, барацьба з правым і «левым» апартунізмам, уздым вытворчага энтузіязму рабочых мас забясьпечылі выкананьне пяцігодкі па радзе галін прамысловасьці за значна кароткейшы тэрмін.

Рост валавой прадукцыі рэспубліканскай і саюзнай прамысловасьці ВСНГ за гадох пяцігодкі выяўляецца ў наступным:

млн. руб. (1926-27 г.)	1928-29 г.	1929-30 г.	1930-30 г.	Выканаўчае пляну 1931 г. да 1932-33 г. паводле пяцігодкі
Па пяцігадовага пляну . . .	161,3	203,9	296,1	526,6
Фактычна	162,2	279,1	449,5*)	449,5*)
Выкананьне у	100,5	151,4	151,9	85,3

Як відаць з прыведзеных лічбаў рэспубліканская і саюзная прамысловасьць БССР паступова в году ў год перавышаюць на валавой прадукцыі праектаваны пяцігадовага пляну.

Аб'ём валавой прадукцыі 1931 г. вельмі блізка падыходзіць да ўзроўню апошняга году пяцігодкі (526,6 млн. руб.). Розьніца паміж выпрацоўкай 1932-33 г. і выпрацоўкай 1931 г. не складае паваг і 15 проц.

У сувязі з гэтым праектаваны 1932 г. поўнасьцю забясьпечваецца дасягненьне ўзроўню апошняга году пяцігодкі — 1932-33 г. і такім чынам выкананьне пяцігадовага пляну за чатыры гады. Сума прадукцыі, якая павінна быць выпушчана за 5 год паводле пяцігадовага пляну, таксама выконваецца за 4 гады (100,6 проц.).

Побач з агульным выкананьнем пляну за чатыры гады па асобных галінах прамысловасьці наглядаецца адставаньне. Зараз ужо можна падвесьці папярэднія, праўда, вельмі арыентовачныя вынікі, па асобных галінах прамысловасьці. Яны наступныя:

а) выконваюць пяцігодку за 4 гады па ўзроўні валавой прадукцыі і суме яе за 5 год:

Мэталяапрацоўчая прамысловасьць, дрэваапрацоўчая, шаўковая, шпалерная, штучнага шоўку, швейная, гарбарна-абутковая, паліграфічная, галантарэйная.

б) выконваюць пяцігодку за 4 гады па ўзроўні валавой прадукцыі ў апошнія годзе:

Тарфяная прамысловасьць, керамічная, шклянная, харчовая.

в) Адстаюць у выкананьні 5-ці гадовага пляну:

Хэмічная прамысловасьць, ільняная, бавоўняна-папяровая, трыкатажная, запалкавая.

У выніку бурнага разгортваньня прамысловасьці БССР удзельная вага, вядучая роля яе ўсё больш узрастаюць. Уступленьне ў апошні год пяцігодкі — 1932 г. — адзначаецца з далейшым разгортваньнем прамысловасьці характарызуецца пераважай яе валавой прадукцыі над прадукцыяй сельскай гаспадаркі.

Калі ў 1928 г. валавая прадукцыя ўсёй прамысловасьці складала ў народнай гаспадарцы БССР усяго 23,6 проц., дык у 1931 г. яна дасягнула амаль 52 проц.

Такім чынам на працягу першых трох год пяцігодкі забясьпечаны ўжо рашаючыя зрухі ў пераўтварэньні БССР з аграрнай краіны ў індустрыяльна-аграрную.

РАБОЧАЯ СІЛА. У галіне рабочай сілы, занятай у прамысловасьці, таксама тэмпы росту перакрываюць адведныя праектаваны пяцігадовага пляну.

Наступная павялічваецца ўдзельная вага прамыслова пралетарыяту ў агульнай колькасьці насельніцтва. Колькасьць рабочых па рэспубліканскай і саюзнай прамысловасьці дасягае ў 1931 г. 57 тыс. чал. і складае звыш 135 проц. пляну на 1930-31 г. па пяцігодцы і звыш 88 проц. пляну яе апошняга году —1932-33 г.

Апошні год пяцігодкі — 1932 — будзе характарызавацца дасягненьнем ў асноўным колькасьці рабочых, намечанай пяцігадовым планам на 1932-33 г.

Адначасова са значным ростам рабочай сілы, занятай у прамысловасьці, узрастае на вытворчасьці колькасьць жанчын. Калі ў 1928 г. колькасьць жанчын-работніц складала каля 35 проц. да агульнага ліку рабочых, у 1931 г. яна падыходзіць да 47 проц.

Таксама карэнным чынам зьмяняюцца ўковы працы ў прамысловасьці ў параўнаньні з пачаткам пяцігодкі. У 1931 г. на 7-гадзінным рабочым дні працавала ўжо звыш 70 проц. рабочых. На працягу пяцігодкі год адбыліся нязвычай вялікія зрухі ў сацыялістычнай арганізацыі працы. Ударніцтва і сацспаборніцтва зрабіліся асноўнымі мэтадамі работы. Праца стала справай гонару рабочых мас.

КАПІТАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА. Вынікова даныя на капітальным будаўніцтве шуць на ўзроўні праектаваньняў пяцігадовага пляну.

Агульная сума капі

РЭЗАЛЮЦЫЯ ЦК КПП

Па пытаньні аб перамаганьні ідэалёгічнай спадчыны люксэмбургіянства ў КПП

Ліст тав. Сталіна ў рэдакцыю «Пролетарской революции» мае для ўсяго камуністычнага інтэрнацыяналу і асабліва для яго польскай секцыі—КПП — вялізарнае прынцыповае і практычнае значэньне.

Паставіўшы з усёй востраснью і высьветліўшы гістарычную ролю бальшавізму ў яго непрымірымай прынцыповай барацьбе з усякага роду апартуністычнымі ўхіламі, тав. Сталін мабілізаваў і завастрыў пільнасьць камуністычных партый супроць трацкісцкай контрабанды, рэвізіі асноўных прынцыпаў ленінізму і ліберальных прымірэнцкіх адносін да чужых і варожых ленінізму поглядаў. Як трацкісцкія, так і брандлерыянскія рэгалты камунізму для барацьбы супроць Камуністычнага Інтэрнацыяналу карыстаюцца зброяй з арсэналу люксэмбургіянства.

КПП, як пераемніца традыцый СДП і Л, павінна правяць выключную пільнасьць да ўсякіх спроб абароны або паўтарэньня памылак люксэмбургіянства і правесьці грунтоўную засьлядоўную ленінскую самакрытыку ідэалёгічнай спадчыны люксэмбургіянства.

У вядомай крытыцы брашуры Юніўса (Р. Люксэмбург) Ленін падкрэсьліваў неабходнасьць «самакрытыкі і ўсебаковай правоўкі поглядаў, якія (самакрытыка і правоўка) павінны паслужыць ідэйнай базай для 3-га інтэрнацыяналу».

СДП і Л — НАЙБОЛЬШ ТЫПОВАЯ ПРАДСТАЎНІЦА ЛЮКСЭМБУРГІЯНСТВА ў II інтэрнацыянале — у важнейшых асноўных праблемах пралетарскай рэвалюцыі, і перш за ўсё ў пытаньні аб перарастальні буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную, у нацыянальным пытаньні, у сялянскім пытаньні, у арганізацыйным пытаньні, займала **ПАМЫЛКОВУЮ ПАЗЫЦЫЮ І ПРАЦЯГВАЛА ЯЕ БАЛЬШАВІЗМУ**, які ўжо ў 1903-1905 г. г. афарміўся, як адзіны сапраўды марксыцкі напрамак у II інтэрнацыянале, які праводзіў непрымірымае і пасьлядоўнае змаганьне з апартуністамі як на Захадзе, так і ў Расіі.

Таму выказаны на 3-м зьезьдзе КПП погляд, быццам-бы СДП і Л была польскай відазьменай бальшавізму, а розьніца паміж ёю і бальшавікамі знаходзілася ў межах бальшавізму, зьяўляецца памылковым. Гэты погляд затрудняе разуменьне і перамаганьне памылак люксэмбургіянства.

БУЗЛАВЫН ПУНКТАМ ПАМЫЛАК СДП І Л ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА КАРЭКТЫЎНЫЯ, НЕБАЛЬШЫВІЦКІЯ АДНОСІНЫ ДА ПЫТАНЬНЯ АБ УЛАДЗЕ І РУХОВЫХ СІЛАХ РЭВАЛЮЦЫІ.

Люксэмбургіянства адмаўляла ленінскую тэорыю дыктатуры пралетарыяту і адзіна правільнай ленінскай канцэпцыі перарастаньня буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную рэвалюцыю пралетарыяту, процістаўляла па суткасьці поўменшавіцкую схему «пермаэнтнай рэвалюцыі», якая выводзілася таксама і Троцкім. У сувязі з гэтым СДП і Л не крытыкавала адзіна правільнага ва ўмовах буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі лёзунгу рэвалюцыйна-дэмакратычнай дыктатуры пралетарыяту і сялянства.

З памылковых адносін да пытаньня аб рэвалюцыйнай дыктатуры выцякала і тое, што СДП і Л у 1905 годзе адхіляла саветы рабочых дэпутатаў, якія ўжо тады складалі зачаткі рэвалюцыйнай улады, а таксама пазьнейшыя апартуністычныя памылкі Розы Люксэмбург, крытыкуючай бальшавіцкі і савецкую ўладу да разгон Устаноўчага сходу, ужываньне рэвалюцыйнага тэрору і г. д.

Чужым быў СДП і Л ленінскі прынцып гегемоніі пралетарыяту ў вызваленчай барацьбе ўсіх прыгнечаных, раней усяго сялянства і прыгнечаных нацый. У сувязі з гэтым СДП і Л адхіляла ленінскі прынцып рабоча-сялянскага саюзу і ўпарта змагалася супроць лёзунгу самавызначэньня, які стабілізуе на барацьбу з імпэрыялізмам самыя шырокія масы прыгнечаных і пазьняволеных нацый. Памылковы погляд на нацыянальнае пытаньне перашкаджаў СДП і Л (абазьвіны фракцыям яе: «зажоновцам» і «разломовцам»), весьці пасьлядоўную барацьбу з імпэрыялізмам, у асаблівасьці ў перыяд імпэрыялістычнай вайны (адносны да нацыянальных войнаў, да паўстаньняў, да ірляндзкага паўстаньня і г. д.).

Механічна абумоўліваючы разьвіцьцё і заняпад капіталізму ад замежных рынкаў, Роза Люксэмбург дала памылковую поўменшавіцкую тэорыю імпэрыялізму, якая адрывае імпэрыялізм ад яго самых асноўных рысаў (манапалістычнае загніваньне капіталізму, панаваньне фінансавага капіталу). Роза Люксэмбург разьвіла апартуністычную тэорыю аўтаматычнага краху капіталізму, які зьяўляецца вынікам вычарпаньня некапіталістычных рынкаў збыту, тэорыю, якая ўжа пярэчыць марксыцка-ленінскай тэорыі, зыходзячай з разьвіцця ўнутраных супярэчнасьцяй капіталізму, якія знаходзяць сваё выражэньне ў сацыялістычнай пралетарскай рэвалюцыі.

Механічны падыход да працэсу капіталістычнага разьвіцьця выяўляўся таксама асновай так званай «тэорыі арганічнага ўрастаньня». Правільна падкрэсьліваючы, што прамысловасьць б. царства польскага вырасла ў сувязі з збытам на расійскіх рынках, што таксама чынам, побач з барацьбой супроць рэвалюцыйнага руху, эканамічныя інтарэсы польскай буржуазіі зьвязвалі яе з царызмам. Роза Люксэмбург схематычна адсюль рабіла вывад аб поўным зьліцьці гаспадарчых сыстым Расіі і царства польскага ў адно непарыўнае цэлае, аб поўным зьліцьці польскіх пануючых клясаў з расійскімі. Роза Люксэмбург ня бачыла, што ў імпэрыялістычнай дзяржаве ўлада знаходзіцца раней усяго ў руках кіруючых клясаў пануючай народнасьці і недаацэньвала антаганізму паміж даволі высокай ступенью капіталістычнага разьвіцьця царства польскага і дзяржаўнай формай царызму.

Памылковая люксэмбургіянская пазыцыя СДП і Л у нацыянальным пытаньні перашкаджала пралетарыяту Польшчы адыграць ролю гегемона ў адносінах да шырокіх мас дробнай буржуазіі і сялянства, больш таго, затрудняла партыі барацьбу з уплывам дробна-буржуазнага сапыял-патрыятызму ППС на рабочыя масы.

З гэтай механічнай установкі ў пытаньні аб заняпадзе капіталізму выцякала тое, што люксэмбургіянства перанавялічвала ролю стыхійнасьці ў рэвалюцыі і памяншала ролю суб'ектыўнага фактару, змагалася з бальшавіцкімі прынцыпамі пабудовы партыйнай арганізацыі, лічачы іх бланкізмам, атмаўляла ленінскае вучэньне аб партыі, як арганізатара рэвалюцыі і арганізатара ўсябрэднага паўстаньня. Адсюль чужая рэвалюцыйнаму марксызму люксэмбургіянская тэорыя стыхійнасьці, «арганізацыі, як працэсу». Праяўленьнем гэтай памылковай пазыцыі СДП і Л у пытаньні аб масавых арганізацыях пралетарыяту — зьяўляюцца сэктанцкія адносіны да профсаюзаў, якія разглядаюцца як прыдатак да партыі.

Па пытаньні расколу паміж бальшавізмам і меншавізмам разам з яго трацкісцкай разнавіднасьцю галоўнае кіраўніцтва СДП і Л займала прымірэнцкую і цэнтрысцкую пазыцыю, уваходзячы ня раз у блёк з меншавікамі і трацкістамі супроць бальшавікоў (Брусэльская канфэрэнцыя).

Люксэмбургіянства, складаючы дактрыну зусім выкрышталізаваную і якая моцна ўкаранілася сярод польскіх рэвалюцыянэраў, доўга яшчэ пасьля ўзьнікненьня КПП зьяўлялася афіцыяльнай ідэалёгіяй партыі і побач з пагубнымі меншавіцкімі тратымі лявіцы ППС зьяўлялася сур'ёзнай перашкодай у пераходзе партыі на пазыцыі ленінізму. У практыцы люксэмбургіянская дактрына цяжка адбілася на лёсе пралетарскай рэвалюцыі ў імпэрыялістычнай паваенай Польшчы, прыняўшаючай заваяваньня народнасьці. Памылковая люксэмбургіянская дактрына на працягу доўгага часу не давала нашай партыі разьвіць бальшавіцкую пралетарскую стратэгію: заваяваць рэвалюцыйных саюзьнікаў у асобе сялянскіх і працоўных мас, закабаленых народнасьцяй для пераможнай сацыялістычнай рэвалюцыі (1918, 1920, 1923 г.).

Афіцыяльны разрыў з люксэмбургіянствам наступіў толькі на 2-м зьезьдзе КПП у 1923 годзе. Але тагочасная кіруючая група партыі з т. т. Варскім і Кастшэвой на чале **ПРАВЯЛА ЭКЛЕКТЫЧНУЮ АПАРТУНІСТЫЧНУЮ КРЫТЫКУ ЛЮКСЭМБУРГІЯНСТВА, НЕ ПРАВОДЗЯЧЫ НІ Ў ТОЙ ЧАС, НІ ПАЗЬНЕЙ РЭВІЗІІ МЕНШАВІЦКАЙ ІДЭАЛЁГІІ І СПАДЧЫНЫ ЛЯВІЦЫ ППС**, правая група т. т. Варскага і Кастшэвы прыняла толькі «праграмныя лёзунгі бальшавізму, але яе зьлела і, як пазьней аказалася, не хацела выхаваць партыі ў духу бальшавіцкай рэвалюцыйнай тактыкі, якая толькі здольна травесьці ў жыцьцё лёзунгі камуністычнай праграмы» (з ліста Выканкому Кі). Невыпадковым было з боку правай верхавіны Варскага-Кастшэвы патрыманьне групы Брандлера ў брацкай нямецкай партыі і патрыманьне апавыцыі Троцкага супроць бальшавіцкага ЦК УсесКП(б) у цяжкі момант пасьля сьмерці Леніна.

Доўга абараняла люксэмбургіянская пазыцыі ўльтра-левая плынь (Гэкох, Домскі), упарта змагаючыся з ленінскай лініяй Камінтэрну і бальшавізацыі нашай партыі. Плынь гэта з часам нератваралася ў польскую разнавіднасьць трацкізму.

Кіруючыя кадры КПП не правялі пасьлядоўнай ленінскай крытыкі люксэмбургіянства, а значная частка кадраў СДП і Л у Савецкім Саюзе заглядалася на рэвалюцыйныя тралыцы СДП і Л, упарта абараняла памылкі люксэмбургіянства.

Абарона памылак люксэмбургіянства ярка выявілася яшчэ два гады таму назад у артыкуле тав. Малеўскага, погляды якога ў агульным ідуць па лініі поглядаў, выказаных Слуцкім.

Памылкі люксэмбургіянства карэніліся таксама ў пазыцыі СДП і Л у адносінах да Берасьцейскага міру і ў пераходзе асноўных кадраў СДП і Л у Савецкай Расіі на пазыцыі так званага «левага камунізму».

Цяжкія вопыты мінулых баёў зьвярнулі ўвагу ўсёй партыі на глыбокія ідэалёгічныя крыніцы далучаных памылак, пашкаджаючых працэс бальшавізацыі нашай партыі. Сур'ёзныя дасягненьні КПП у сялянскім і нацыянальна-вызваленчым руху, узрастаючая самастойная роля партыі ў штодзеннай забастовачнай барацьбе пралетарыяту, рост партыйных арганізацый, ня глядзячы на ўмацненьне тэрору фашысцкай дыктатуры, дасягненьні партыі ў ідэалёгічнай галіне — у барацьбе на два фронты — вось вынікі пратрэсуючай бальшавізацыі партыйных радоў.

АЖЫЦЬЦЯЛЕНЬНЕ ГАЛОЎНАЙ ЗАДАЧЫ СУЧАСНАГА МОМАНТУ: ЗАВАЯВАНЬНЕ БОЛЬШАСЬЦІ ПРАЛЕТАРЫЯТУ, А ПАД ЯГО ГЕГЕМОНІЯЙ ЗАВАЯВАНЬНЕ АСНОЎНЫХ ПРАЦОЎНЫХ МАС СЯЛЯНСТВА І ПРЫГНЕЧАНЫХ НАРОДАЎ, АРГАНІЗАЦЫЯ ПЕРАМОЖНАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ Ў ПОЛЬШЧЫ — ПАТРАБУЕ БАЛЬШАВІЦКАГА ПЕРАМАГАНЬНЯ ІДЭАЛЁГІЧНАЙ СПАДЧЫНЫ ЛЮКСЭМБУРГІЯНСТВА.

У гэтых адносінах дырэктыва V-га зьезду КПП аб «давядзеньні да канца рэвізіі люксэмбургіянства ў духу ленінскіх установак у асноўных праблемах рэвалюцыі» стаіць на ўсёй шырыні перад партыяй. Гістарычныя заслугі СДП і Л у барацьбе з нацыяналізмам, у інтэрнацыянальным выхаваньні польскага пралетарыяту, у брацкім яднаньні польскіх і расійскіх рабочых, кіруючая роля СДП і Л у рэвалюцыі 1905 году ў царстве польскім, а таксама той факт, што з усіх партый II Інтэрнацыяналу яна была самай блізкай бальшавікам і з самата пачатку стала ў рады рэвалюцыі 1917 г. — усё гэта ўскладае на КПП тым больш абавязкі правядзеньня грунтоўнай рэвізіі люксэмбургіянства.

Перажыткі люксэмбургіянства, якія выкрываюцца яшчэ і зараз у практыцы КПП, знаходзяць сваё аллюстральнае ў недаацэнцы штодзеннай барацьбы ў нацыянальна-вызваленчым руху, у супрацўленьні пазасобных зьвеньняў партыі ажыцьцяўленьню пералому ў галіне нацыянальна-вызваленчай барацьбы, у хвасьпісцкіх тэндэнцыях і ў недаацэнцы арганізацыйных задач і г. д.

Крытыка люксэмбургіянства павінна зрабіцца асноўным фактарам бальшавізацыі ўсёй партыйнай практыкі, як у тактычнай, так і ў арганізацыйнай галіне. Грунтоўная крытыка люксэмбургіянства дапаможа партыі перамагчы адставаньне ад нарастаючых рэвалюцыйных падзей, узьнімі ролю партыі, як ініцыятара і арганізатара ў рэвалюцыйным руху, забясьпечыць партыю ад недаацэнкі партыйнай сялянскага і нацыянальна-вызваленчага руху, дасьць магчымасьць пашырыць і ўмацаваць арганізацыйны апэт партыі.

Выходзячы з гэтых установак, ЦК КПП лічыць неабходным:

1. Крытычнае асьвятленьне асобных бакоў люксэмбургіянства, а таксама ідэалёгіі СДП і Л (тэорыя накапленьня капіталу, тэорыя «пермаэнтнай рэвалюцыі», аграрнае пытаньне, нацыянальнае пытаньне, прынцыпы тактыкі і арганізацыі і г. д.).

2. Далейшую крытыку апартуністычных, эклектычных адносін да люксэмбургіянства, бяльшаючую барацьбу з кантрабандай люксэмбургіянскіх поглядаў у партыйных выданьнях і з прымірэнчымі адносінамі да гэтых поглядаў; праверку і крытычны прагляд выданьняў у галіне гісторыі партыі і рабочага руху ў Польшчы, далейшае высьвятленьне ролі меншавіцкіх тэндэнцый ППС Лявіцы, як адной з перашкод да бальшавізацыі партыі.

3. Паскарэньне распрацоўкі праграмы партыі для фармулёўкі і ўмацаваньня ленінскіх асноў партыйнай ідэалёгіі.

4. Пагльбленьне ленінскага выхаваньня партыі шляхам выданьня асноўных твораў Леніна, а таксама раду прац з галіны марксыцка-ленінскай ідэалёгіі.

У фашысцкай Польшчы

ПАГРОМШЧЫКІ НА СПЫНЯЮЦЬ „ДЗЕЙНАСЬЦІ"

Зьезд рабінаў выказвае Пілсудзкаму вернападданіцкія пачуцьці

ВАРШАВА, 11. Антысэміцкая «Ліга зялёнай істужкі» пры цікім падтрыманьні ўлады разгортвае на ўсёй Польшчы інтэнсыўную пагромніцкую прапаганду. У радзе гарадоў паўтарыліся антыяўрэйскія выступленьні. У Горадні фашысцкая моладзь раскідвае антысэміцкія праклямацыі.

«Ілюстраваны Кур'ер Цодзенны» за 8 студзеня паведамляе, што ў часе каляд над Люблінам лётаў аэраплян, з якога фашысцкія студэнты раскідалі зялёныя адозвы, заклікаючы да экапамічнага бойкоту і пагромаў яўрэйскай беднаты.

У гэты самы час у сталіцы Польшчы — Варшаве — адбываецца ўсяпольскі зьезд рабінаў. Яны зьехаліся раіцца, як лепш атуманьваць яўрэйскія працоўныя масы, аўтарытэт рэлігіі ў вачох якіх падрываецца і якія ўсё больш і больш рашуча становяцца на шлях рэвалюцыйнай барацьбы супольна з працоўнымі іншых нацый.

Яўрэйскіх мракабесаў ад імя ўрадавага клюбу ў сойме і ад імя прэм'ер-міністра Славэка вітаў п. Мастбаум. Зьезд рабінаў выслаў вернападданіцкую тэлеграму маршалу Пілсудзкаму, пад дыктатуры якога на ўсёй Польшчы коціцца хваля яўрэйскіх пагромаў.

Сяляне сякуць панскія лясы

ВІЛЬНЯ, 11. Сяляне вёскі Лапіцы (Віленшчына) грамадой выехалі па дровы ў лес памешчыка Залешчыцкага. Тры панскія лясьнікі адкрылі на іх страляніну, цяжка параніўшы трох сялян — **А. Лубніса, В. Лісенка і Ф. Пухача.** Абураныя сяляне акружылі панскіх служак, разбройлі іх і зьбілі да страты прытомнасьці. Паліцыя правяла арышты.

Гэты факт самавольнай парубкі панскіх лясоў не зьяўляецца адзіным або выпадковым. Самавольныя парубкі панскіх лясоў у апошнія часы набываюць масавы характар. Яны сьведчаць аб росьце палітычнай сьвядомасьці працоўнага сялянства, аб умацненьні рэвалюцыйнага руху на вёсцы, актывізацыі вёскі. Сяляне ня хочуць спакойна чакаць галоднай і халоднай сьмерці, а пад кіраўніцтвам кампартыі актыўна выступае на барацьбу за свае штодзенныя патрэбы, на барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры.

У Лідзе закрылася адна з буйнейшых фабрык

ВІЛЬНЯ, 12. У Лідзе па неабмежаваны час спыніла работу адна з буйнейшых фабрык Заходняй Беларусі — гумовая фабрыка фірмы «Ардаль». Прычыны банкрутства — **перапрадукцыя тавараў, адсутнасьць рынку збыту і крэдытаў.** Выкінута на вуліцу 386 чалавек: 270 работніц і 86 рабочых. Належачай за апошні месяц зарплаты звольненым ня выплацілі.

Дзесяткі год катаргі

ВІЛЬНЯ, 11. Віленскі акруговы суд разглядаў справу пяцёх абвінавачаных нібы ў «шпіянажы» на карысьць СССР. Гэта папулярнае цяпер у польскіх судох абвінавачаньне, па падставе якога выносяцца сьмяротныя і каторжныя прысуды рабочым і сялянам.

Прыгавораны: **Ядзіга Казлоўская на 10 год катаргі, Ян Мордас і Галена Дыдзінская — на 8 год, Ян Дыдзінскі — на 3 гады і Аляксандар Герасімёнак — на два гады.**

Румынія гатова да інтэрвэнцыі

Рапарт васала французскаму генштабу

1 афіцэр--на 7 салдат

ВЕНА. Як паведамляюць з Бухарэсту, рад румынскіх газэт у сувязі са сканчэньнем году, публікуюць весткі аб росьце баяздольнасьці румынскай армії. Газэта «Унівэрсул» (орган ахранкі, які блізка стаіць і да ваенных колаў) прызнае, што румынская армія, ня гледзячы «на неабходныя бюджэтныя скарачэньні», значна павялічыла за мінулы год сваю баяздольнасьць шляхам ужываньня ў армії ўсіх навейшых завалваньняў ваеннай тэхнікі. Газэта піша, што, такім чынам, **«Румынія гатова ва ўсеўзбраеньні сустрэць любыя магчымасьці ў паўднёва-ўсходняй Эўропе».**

У частцы падрыхтоўкі да хемічнай вайны румынская армія, паводле слоў газэты, прарабіла значныя посьпехі. Газэта піша: «Ваенная тэхніка ў румынскай армії пачынае рабіць сур'ёзныя і радасныя посьпехі». Многае, паводле слоў газэты, было зроблена і ў галіне паветрана-морскага ваеннага флёту. Была створана спэцыяльная «румынская марская ліга», якая атрымала вялікае грашовае патрыманьне. У мінулым годзе быў пабудован рад новых ваенных суднаў, у тым ліку мінныя зьнішчыцелі «Рэжэле Фэрдынанд», «Рэжына Марыя», «Канстанца» і г. д. Газэта прызнае вялікае значэньне таксама меўшаму месца ў мінулым годзе абмену ваеннымі візытамі паміж Румыніяй і саюзнымі ёй краінамі. У ліку гэтых візытаў газэта ўспамінае паездку начальніка румынскага генэральнага штабу Самсонавіча ў Польшчу, наведваньне афіцэрамі былой румынскай вайсковай школы ў Чэха-Славакіі, паездку Пілсудзкага ў Румынію, а таксама сустрэчу румынскіх крэйсэраў «Мэрэшці» і «Мэрэшэшці» з ангельскім ваенным флётам у Мальтэ.

Румынская ваеннічына энэргічна рыхтуецца да інтэрвэнцыі супроць СССР. Аб гэтым сьведчыць уся палітыка баярскай Румыніі, рост яе армії, выпаткаў на ўзбраеньні і рост саміх узбраеньняў. Як падае буржуазная румынская газэта «Адрэгус» ад 2-га сьнежня 1931 г., у Румыніі **на 621 салдата прыпадае 1 генэрал**, у той час, як ва Францыі 1 генэрал прыпадае **на 1.260 салдат**, а ў Італіі — на **1.729.** Адзін старшы афіцэр у Румыніі прыпадае **на 46 салдат**, тады як Францыя мае аднаго афіцэра на 75 салдатаў, а Італія — на 102 і адзін афіцэр на 7 салдат, тады як Францыя мае на 17 салдат аднаго афіцэра, а ў Італіі — 1 на 25.

Афіцэрства ў Румыніі карыстаецца вялізарнымі прывілеямі. Аб тым, якой раскошай абстаўлена жыцьцё афіцэрства, сьведчыць, напрыклад, такі факт, што кожнаму юнкеру, які канчае вайсковую школу, дзяржава для забесьпячэньня яго толькі вайсковай формай **трацінь 7.000 лей.**

Ваенная небясьпека зараз большая, чым у 1914 г.

ВАШЫНГТОН, 11. Былы ваенны міністар ПАЗШ Бэкер заявіў, што ваенная небясьпека ў сучасны момант больш сур'ёзная, чым у 1914 г.

Ваенная праграма ПАЗШ

ВАШЫНГТОН, 11. Морскае міністэрства ПАЗШ хадайнічае перад палатай аб асыгнаваньні **616 млн. даляраў** на пабудову **120 ваенных суднаў.**

„Выкарчоўваньне люксэмбургіянскіх перажыткаў

зьяўляецца прадпасылкай для заваяваньня большасьці рабочае клясы"

(З рэзалюцыі пленуму Бэрлін-Брандэнбурскага акруговага камітэту кампартыі)

БЭРЛІН, 12. «Роте фане» публікуе рэзалюцыю, ухваленую пленумам Бэрлін-Брандэнбурскага акруговага камітэту кампартыі па дакладу сакратара бэрлінскага камітэту т. Ульбрыхта. У рэзалюцыі гаворыцца:

У барацьбе супроць дыктатуры надзвычайных дакрэтаў, гэтага галоўнага фронту капіталістычнага наступленьня, зьявіўся тэндэнцыя накіраваць усе баявыя сілы рабочых выключна супроць тэрору нацыянал-фашысцкай дыктатуры, якая ўзначальваецца Брюнінгам і Грэнэрам, Зэвэрынгам і Лейпартам. Гэта няправільная ўстаноўка адвачасова канцэнтрацыю барацьбы па шэсьці пралетарыяцтвам і сярод дробна-буржуазных мас, дзе ўплыў нацыянал-сапыялістаў вельмі моцны. Правільная канцэнтрацыя сіл на прадпрыемствах, профсаюзах і сярод беспрацоўных значае паскарэньне тэмпу рэвалюцыйнага ўздыму, бо ад заваяваньня большасьці пралетарыяту залежыць перамога над буржуазіяй і гэтым самым над фашызмам. Гэтыя слабасьці ў праяўленьні тактычнай лініі праявіліся таксама і ў тым, як ужываўся лёзунг народнай рэвалюцыі.

Брандлер і кампанія прабуюць у першую чаргу ў Бэрліне прыкрыць імем Розы Люксэмбург сваю контр-рэвалюцыйную палітыку. Яны пагльбляюць памылкі Розы Люксэмбург, асуджаныя Леніным яшчэ да вайны.

Супроць гэтых «левых» агентаў буржуазіі ў радах рабочае клясы павінна наша партыя накіраваць галоўны агонь таму, што яны зьяўляюцца небясьпечнейшымі прадстаўнікамі сапыял-фашысцкай палітыкі. Бліжэйшая стратэгічная мэта нашай партыі зьяўляецца заваяваньне большасьці рабочае клясы. Здольнасьць нашай партыі ўцягнуць рабочыя масы ў непасрэдную барацьбу за дыктатуру пралетарыяту зьяўляецца рашаючай задачай для таго, каб разьбіць клясавага ворага. Таму т. Тэльман паставіў перад бэрлінскай арганізацыяй задачу—цэнтр цяжару барацьбы кампартыі павінен быць перанесен на прадпрыемствы.

Ліст тав. Сталіна ў рэдакцыю часопісі «Пролетарская революция»—«аборыцца далей у рэзалюцыі—мае вялікае актуальнае значэньне для нашай партыі. Выкарчоўваньне сапыял-дэмакратычных, цэнтрысцкіх і люксэмбургіянскіх перажыткаў у нашай партыі зьяўляецца прадпасылкай для заваяваньня большасьці рабочае клясы. Бальшавізацыя нашай партыі зьяўлялася і зьяўляецца барацьбой супроць усіх правых і «левых» апартуністычных ухілаў ад ленінізму і асабліва барацьбой супроць поўменшавіцкіх поглядаў люксэмбургіянства, якія ў асаблівасьці прадстаўляюць брандлераўцы. Спроба контр-рэвалюцыйнага трацкізму шляхам фальсыфікацыі вопыту гісторыі апартуністычна зброўзіць нашу партыю, прымушае нас завастрыць барацьбу супроць фальсыфікацыі гісторыі Камінтэрну і КПР. (ТАСС).

Па СССР

Новы будаўнічы матар'ял „Вісьміт"

адкрывае новую эру ў будаўнічай справе ва ўсім сьвеце

МАСКВА. Навуковыя работнікі Паўночна-Каўкаскага аддзяленьня інстытуту будматар'ялаў Шмялёў і Герфідс атрымалі з «кровельных» сланцоў новы будматар'ял, названы імі **«вісьміт». Ён у 9 раз лягчэй і на 40 проц. таней цэглы**, адрозьніваецца пяначай цеплаправоднасьцю, водаапрацякальны і лёгка пераносіць рэзкія зьмены тэмпэратуры. Маючы па сваіх тэхнічных уласьцівасьцях вялізарную перавагу над усімі вядомымі да гэтага часу будматар'яламі, гэты матар'ял адкрывае новую эру ў будаўнічай справе ня толькі ў СССР, але і ва ўсім сьвеце.

Працэс атрыманьня «вісьміту» не складаны і займае ўсяго каля 5 гадзін. Прэзыдыум Паўночна-Каўкаскага ВОНГ пастанавіў да 1-га лютага пабудаваць вопытную ўстаноўку па вырабе «вісьміту». Прэзыдыум Массавету таксама паручыў тэрмінова арганізаваць у Маскве вопытную ўстаноўку па вырабе новага будматар'ялу.

Нафта — у рэйне возера Байкал

ІРКУЦК. На паўночна-ўсходнім беразе Байкалу каля сяла Пасольская, Баргузіна і хутара Сваловая разведка «Востоконефти» атрымала на глыбіні 105 мэтраў першую інтэнсыўную выцяжку нафты, што дае магчымасьць меркаваць аб месцазнаходжаньні нафтавага пласта. Гэты пласт, паводле думкі матрасьведкі Ізюмцэва Лыжына, цягнецца мінімум на 200 клм. Зараз разьведка прыступае да новага спосабу — сьвідраваньня дна возера (Байкал) праз лёд. Сьвідраваньне будзе праводзіцца за поўкілёмэтра ад берэгу на спэцыяльна прыпарожным да берэгу вестраве з лёду.

Паведамленьні

— **Дом Камасьветы**, 14-1, у 7 гадз. веч. адбудзецца вечар для партыйнага і камсамольскага актыву, прысьвечаны гадзіне рэвалюцыі 1905 г. 1) Даклад прэзыдэнта БАН т. Горына «Характар рэвалюцыі 1905 г.». 2) Канцэрт. Білеты ў Гаркоме КП(б)Б.

— **Культпроп гаркому КП(б)Б** паведамляе ўсе ячэйкі КП(б)Б, што, згодна пастановы бюро гаркому, дзень партасьветы з 18 перазносіцца на 16 студзеня 1932 г. Астатнія дні партасьветы застаюцца бяз зьмен.

Да ведама дэлегатаў 2-й менскай партканфэрэнцыі

2-ая Менская Гарадзкая Канфэрэнцыя КП(б)Б адкрываецца 15-га студзеня ў 6 гадз. вечара ў памяшканьні дому Камасьвет.

Сакратар Гаркому Кавальчук.

Пастанова Мехгарсавету

№ 2/16 ад 9/1—32 г.

1) Усе ўстановы і арганізацыі, якія мяркуюць у 1932 г. праводзіць работы, зьвязаныя з раскопкай вуліц, тэатраваў і плошчаў, павінны **не пазьней 20 студзеня 1932 г. прадставіць ў аддзел камунальнай гаспадаркі свае праекты** і цьвёрды каляндарны план работ на ўвязку і атрыманьне дазволу ад Камгасу.

2) Неправяраўваньне паказаных даных у тэрмін пазбаўляе іх права выгтварэньня якіх-бы та ні было расходаў па гораду.

Старшыня гарсавету **Валодзька.**
Сакратар **Шалкавец.**

15 студзеня 1932 г. у 6 гадзін вечара, у клюбе Мэдсанпрацы (Узвалюцыйная вул., 2-24) адкрываецца

1-я ўсебеларуская канфэрэнцыя па ўтылізацыі адкідаў і адходаў народнай гаспадаркі.

)—(ПАРАДАК ДНЯ:)—(

1. Скарыстаньне прамысловых адкідаў па Беларусі і іх значэньне (т. в. Шапіра).
Суладкладны: а) арганізацыі ўтыльдыхаў на прадпрыемствах (т. Русаноў); б) роля навукова-даследчых інстытутаў у справе скарыстаньня адходаў (праф. Прылежаеў).
2. Масавая праца па галіне ўтылізацыі адходаў.
3. Пахатная зборка ўтыльсыравіны.

Выдача мандатаў бліжэй ўтварацца мандатнай камісіяй у клюбе Мэдсанпрацы 15-1—32 г. да 10-ай г. ран.

АРГБЮРО

4-ы пленум ЦК МОПР'у БССР

ПЕРАНОСІЦЦА

з 25-га на 30 студзеня ў Віцебску.

ЦК МОПР'у зварачаецца да ўсіх членаў і кандыдатаў ЦК, а таксама да ўсіх запрошаных удзельнікаў пленуму зьявіцца не пазьней 30-га студзеня раніцою ў Віцебск на пленум.

Сакратар ЦК МОПР'у БССР **ЦУДЗІН.**

Драмдзяжвы і патаемны завод „Чырвоны Золаг"

ЗАТРАШАЕ

на стаўную працу
1 бухгалтара,
1 памочніка бухгальтара,
1 рахункавода.

Аплата па згодце.
Магчыма на скарочаны рабочы дзень.
Адрас: Ляхаў-а, вул. Варашылава, 16, тэл. 5-81.

Чы). Зорка — Каса адкр. з 1 г. дня
Мастацкі японскі фільм **ШТО ЯЕ ЗРАБІЛА ГЭТКАЙ** (СУМІНА) драма ў 6 ч.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — Каса адкр. з 12 г. дня
Замежн. мас. фільм **ПАСЬНІКІ БЭРЛІНУ** у гал. ролі Бэрнгардт Гэ ргге.

ПРАЛЕТАРЫ — Каса адкр. з 12 г. дня
Амэрык. трукавая камэдыя **ПАЗНАЁМЦЕ МЯНЕ** у 7 частках. У гал. ролі Дуглас Мак-Лін

„СПАРТАК" — Пач. б. 7-30, 9 і 10-45. Каса—ад 5.
Выдатны фільм **КРЫЖ І МАУЗЭР** трагэдыя ў 8 частках.

ДОМ ПРАЦАЎЬЕТЫ
14 студзеня—к і н а
ШЧАСЬЛІВЫЯ ЖОЛЬЦЫ
Увахд па чл. кнігінскага саюзу працаўьеты.
Пачатак у 9 гадз. веч.

Швейная фабрыцы „НАСТРЫЧНІК"
ПАТРЭБЕН ГАЛОЎНЫ БУХГАЛЬТАР.

УВАГА! НА БАРАЦЬБУ за 25.000 ТЫРАЖ! УВАГА!

Пасьпяшэцеся з падпіскай на газэту

„ТРЫБУНА РАДЗЕЦКА"

на 1932 год.

Падпісваецеся і распаўсюджвайце камуністычную польскую штодзенную газэту „Трыбуна Радзецка".

Чытачы, падпісчыкі, упаўнаважаныя, штурмавыя брыгады друку, карэспандэнты—распаўсюджвайце „Трыбуну Радзецку"!

Падпіску здавайце ў лістаносцам або ў бліжэйшыя паштовыя аддзяленьні **не пазьней** тэрміну, які вызначан **мясцовымі паштовымі аддзяленьнямі.** Атрымаяе пазьней падпіска аўтаматычна пераносіцца на наступны месяц.

Рабочым, пазьнікі, вучасобнікі! Падпісвайцеся своечасова на „Трыбуну Радзецку" на 1932 год!

„Трыбуна Радзецка" каштуе:

На 1 месяц	60 кап.	На 6 мес.	2 руб. 50 к.
„ 3 „	1 р. 50 кап.	„ 12 „	5 руб. —

Калектыў супрацоўнікаў і дырэкцыя Беларлодгародніны вынуждаюць глыбокае спачуваньне сям'і трагічна загінуўшага 12 студзеня супрацоўніка Беларлодгародніны

ФОРШТЭРА ДЫЗІКА Невахова.

Адміністрацыя і калектыў цэнтральнай рабочай паліклінікі з шчырым жалем паведамляюць аб сьмерці супрацоўніка

Д-ра Л. Н. ШАПІРА.

Пахаваньне адбудзецца 15 студзеня, у 3 гадз. дня.

ЗГУБЛЕНА кандыдацкая картка, выд. Менгаркомам КП(б)Б на імя Стрыгунова А. І., лічыць несапраўднай.

НОВАЯ ЧАСОПІСЬ

З 1-га студзеня 1932 г. пачынае выходзіць

З 1-га студзеня 1932 г. пачынае выходзіць

кніжнай і бібліятэчнай справы, бібліяграфіі і прапаганды кнігі

КНІГА МАСАМ

Выданьне ДВБ і кніжнай палаты пры Белдзяржбібліятэцы.

У ЧАСОПІСІ

будуць наступныя пастаянныя аддзелы

1. Кніжная і выдавецкая справа . . . .
2. Бібліятэчная справа .
3. Бібліяграфія . . . .
4. На дапамогу аўтарам (перапіска з пісьменьнікамі і паэтамі-пачынальнікамі) . . . .
5. На дапамогу чытачу .
6. Хроніка выдавецва . .

Акрамя таго, кожны нумар яшчэ будзе мець дадаткі:

Рэкамэндацыйны бюлетэнь бібліяграфічнага бюро Белдзяржбібліятэкі і Летапісь друку БССР.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА: (з дадаткамі «Летапісь» і рэкам. бюлетэнь)
на 1